

Навіны
Беларускага Народнага Фронту «Адраджэньне»

5'1991

Кошт 59 кап.

Кожны дзень жонка Валерыя Сядова Ірына з дачкой Насьцяй прыходзілі да сьледчага ізалятару па вул. Валадарскага, 2, але перадачы ў іх не прымалі.

Фота Ул.Панады.

АРЫШТ

7 траўня пастановаю Пракуратуры БССР №257090, падпісанай кіраўніком сьледчае групы старшым саветнікам юстыцыі В.Собалевым, быў арыштаваны й зьмешчаны ў сьледчы ізалятар (СІЗО) актыўны ўдзельнік руху Беларускага Народнага Фронту, супрацоўнік нашае газэты Валеры Сядоў. За ўдзел у антыкамуністычным мітынгу, які адбыўся ў Менску 7 лістапада мінулага году, В.Сядову інкрымінуюць 2 артыкулы. Паводле артыкула 186 КК БССР В.Сядоў абвінавачваецца ў «актыўным удзеле ў групавых дзеяньнях, якія груба парушылі грамадзкі парадак» і паводле артыкула 201 ч.2 КК БССР – ў «публічнай непавазе да грамадзтва й агульнапрызнаных нормаў маралі».

На думку Пракуратуры БССР, В.Сядоў вінаваты ў тым, што падчас мітынгу, «праявіўшы цынізм і асаблівую дзёрзкасьць, прымацаваў да помніка У.І.Леніну пудзіла ў выглядзе надзетае на крыж ватоўкі», чым «зьняважыў гістарычны помнік манумэнтальнага мастацтва, зьняважыў грамадзкую маральнасьць, праявіў яўную непавагу да народных традыцыяў і гісторыі Бацькаўшчыны».

У пастанове на арышт пракуратура сфальсіфікавала мейсца працы Сядова: было напісана, што ён «беспрацоўны».

ПЕРШАПРЫЧЫНА

7 лістапада 1990 у Менску па ініцыятыве БНФ быў праведзены антыкамуністычны мітынг-шэсьце, падчас якога некалькі дзесяткаў тысячаў людзей прайшлі па Ленінскім праспэкце да пляца Леніна зь лёзунгамі антытаталітарнага зьместу, а таксама сымболямі ленінска-сталінскага тэрору: пудзіламі нкусаўцаў, вязьняў ГУЛАГу, будаўнікоў сацыялізму ў гумовых ботах і ватоўках, муляжамі шыбеніцаў з надпісамі «сацыялістычны выбар» і «камуністычная пэрспэктыва». Усе гэтыя сымболі рэжыму, якія пазьней атрымалі назву «дары Леніну», у ходзе мітынгу былі ўскладзеныя да помніка заснавальніку бальшавіцкае дзяржавы.

Падчас «вяртаньня дароў» узьнікла ініцыяваная міліцыяй сутычка. На заклікі Зянона Пазьняка да міліцыянтаў утварыць жывы калідор і даць магчымасьць некальім чалавекам прайсьці да помніка, ахоўнікі правапарадку кінуліся на натоўп, які ў сваю чаргу, справакаваны міліцыяй, ірвануўся да помніка. Узьнікла штурханіна.

«АРГАНІЗАЦЫЯ НАРОДНАГА ГНЕВУ»

Сам факт правядзеньня антыкамуністычнага мітынгу, які дарэчы быў дазволены ўладамі, не даваў дастатковых падставаў для адкрыцьця крымінальнае справы. Але, маючы намер адбіць у беларускага народу ахвоту змагацца з таталітарызмам, а таксама разьлічваючы паквітацца з БНФ, ЦК КПБ праз партыйны друк распачаў прапагандысцкую кампанію супроць антыкамунізму й антыкамуністаў.

На грамадзкую сьвядомасьць абрынуўся цэлы шквал «лістоў працоўных», часта падпісаных сакратарымі партыйных арганізацыяў КПСС, з патрабаваньнямі хуткага й суровага пакараньня вераадступнікаў. Адным з галоўных «народных абвінаваўцаў» стаў блізкі да «Памяти» старшыня Беларускага хрысьціянскага саюзу А.Насенка, які падчас афіцыйнага ўслаўленьня чарговае гадавіны бальшавіцкага перавароту, якое папярэднічала мітынгу БНФ, стаяў на ўрадавай трыбуне побач са старшынём ВС БССР Мікалаем Дземянцеем, а зараз адбывае турэмнае пакараньне за крадзеж і махлярства.

(Працяг на стар.3)

Санкцыяваная ЦК КПБ справа Валерыя Сядова набыла нечаканы для яе арганізатараў паварот. Абвінавачваньні Фронту ў зьнявазе сымболяў марксізму-ленінізму адыйшлі на другі плян. Ліст В.Сядова ў пасольства ЗША, а таксама вынікі дэпутацкае праверкі ўмоваў утрыманьня ў СІЗО №1, якая была праведзеная З.Пазьняком і Я.Новікавым, прымусілі зьвярнуць увагу на «беспредел», які твораць улады ў дачыненьні да зьмешчаных у сьледчы ізалятар падсьледных. Выглядае на тое, што менавіта пракуратуры давядзецца адказваць за парушэньні правоў чалавека.

СЕМДЗЕСЯТ дзён у СІЗО

РЭПРЭСІІ

КАМЮНІКЕ

На ліпеньскім Сойме БНФ «Адраджэньне»

Асноўнымі тэмамі паседжаньня Сойму 13 ліпеня сталі рэпрэсіі супроць сяброў Фронту й канцэпцыя незалежнасьці Беларусі.

Старшыня БНФ Зянон Пазьняк назваў тое, што ўчынена з Валерыем Сядовым, палітычнай расправаю: «Апазіцыя БНФ у ВС БССР рабіла дэпутацкае запытаньне, зьвярталася да пракурора, наведала турму, перадала дакумэнты, зьвязаныя са справаю Сядова, у Amnesty International, усім гэтым надаўшы справе належны, у тым ліку міжнародны, розгалас».

Да З.Пазьняка выказаліся прэтэнзіі: дэпутаты апазіцыі у ВС ня сталі ў пікеты дзеля абароны Сядова, як лічыла мэтазгодным Управа. Пазьняк ды іншыя сябры Сойму адказалі на гэта, што дэпутатам больш варта максімальна выкарыстоўваць спэцыфічна дэпутацкія сродкі юрыдычнае й палітычнае барацьбы (бадай, ціпер, калі В.Сядоў вызвалены да суда, гэтая рацыя пацьверджаная).

Пытаньне «Аб канцэпцыі незалежнасьці Беларусі» адкрыў выступам намесьнік старшыні БНФ, каардынатар цэнтральнага габінэту апазіцыі, намесьнік старшыні камісіі ВС па навуцы й навукова-тэхнічным прагрэсе Уладзімір Заблоцкі. Цяперашні Вярхоўны Савет, падкрэсьліў ён, будзе імкнуцца захаваць адзіную саюзную структуру – КПСС – і адзіную дзяржаву, і таму падпіша абсалютна недапушчальную саюзную дамову, якая вымушае рэспублікі адмовіцца ад суверэнітэту.

Галоўнае эканамічнае пытаньне – ці зможа Беларусь існаваць самастойна. Ул.Заблоцкі прывёў шэраг аргумэнтаў за станоўчы адказ: «Беларусь па прыкладзе Польшчы выходзіць на рынкі краінаў Усходняе Эўропы. Дарэчы, лунае ў паветры ідэя Балтыйска-Чарнаморскае супольнасьці прыбалтыйскіх краінаў, Беларусі ды Украіны з агульнай эканамічнай прасторай». Ул.Заблоцкі паведаміў пра абяцаньні «цэнтру» падзяліць паміж рэспублікамі дыямэнтавы й валютны фонды.

БНФ павінен падрыхтаваць палітычныя й эканамічныя праграмы пераходу да незалежнасьці, якім-бы паверылі людзі. Ул.Заблоцкі паінфармаваў, што ў верасьні эканамічная праграма будзе гатовая. Магчымая міжнародная экспэртыза праграмы.

Старшыня экнамічна-гаспадарчае камісіі БНФ, сакратар Управы Фронту, народны дэпутат Рэспублікі Сяргей Папкоў зазначыў, што Беларусь можа прыйсьці да незалежнасьці нават насуперак уласнаму жаданьню. «Цэнтар» ставіць такія ўмовы, што рэспублікі вымушаныя навязваць сувязі між сабою. Саюзныя прадпрыемствы, што пераходзяць пад юрысдыкцыю Беларусі будуць у пэўнай ступені самастойныя; зь імі варта навязваць кантакт.

Намесьнік старшыні Народнага Фронту, старшыня Менскае гарадзкое арганізацыі БНФ, народны дэпутат Беларусі Валянцін Голубеў нагадаў, што, з аднаго боку, экономіка патрабуе незалежнасьці, з другога-ж – стрымлівае яе дасягненьне: «Прамысловасьць будавалася такім чынам, каб мы залежалі ад іншых «рэгіёнаў Саюзу». Камуністы гавораць аб суверэннай Беларусі, але ў складзе СССР. Новая саюзная дамова больш страшная чым дамова 1922. Заканадаўча з новага саюзу выйсьці немагчыма, гэта можна зрабіць толькі праз народны рух».

В.Голубеў нагадаў, што Фронт ня раз выказваўся за парлямэнцкую рэспубліку. Пытаньне аб прэзідэнцтве можа быць пастаўлена толькі ў сапраўды незалежнай рэспубліцы з прафэсійным парлямэнтам. Адзін са шляхоў да незалежнасьці – выбары Ўстаноўчага сойму, другі – патрабаваньне стварэньня канфэдэратыўнага саюзу, трэйці – патрабаваньне новых выбараў на шматпартыйнай аснове. Да гэтых выбараў трэба рыхтавацца, ужо ціпер ствараць адпаведныя структуры.

З.Пазьняк нагадаў, што ідэю незалежнасьці БНФ абвясьціў у канцы 1989 у перадвыбарчай плятформе. «Беларусь мы разглядаем як нэйтральную бязьядзерную дзяржаву. Шляхі да незалежнасьці – новыя выбары найвышэйшага органу ўлады або выбары Ўстаноўчага Сойму Беларусі. Кансэрватыўныя сілы выступаюць за падпісаньне новае саюзнае дамовы. Гэта іх канцаліце. Другое пытаньне, якое ставілася намэнклятураю, – гэта пытаньне аб прэзідэнцтве. Але тут яна не была так згуртаваная, і пытаньне не прайшло, палітыка праваліласл. Але яна можа паўтарыцца ўвосень. Прэзідэнцтва выгоднае КПБ, пакуль яна кантралюе ВС, Саўмін і г.д. Ідэя Ўстаноўчага Сойму Беларусі – родам з 1918 году, зь незалежніцкага руху. Ідэя-ж прэзідэнцтва на Беларусі – апаратная. Аднак яе могуць навязаць».

Намесьнік старшыні Юры Хадыка зрабіў грунтоўны гістарычны агляд прынцыпаў дзяржаўнага ўладкаваньня. Ён лічыць, што ў выпадку выбараў прэзідэнта гэтай восеньню магчыма перамога дэмакратычнага кандыдата. Але лёс першага прэзідэнта можа быць незайздросны.

Шмат хто адзначаў, што нас чакае неўзабаве чарговая – тая ці іншая – выбарчая кампанія. Новых выбараў можа дамагацца новая, восеньская хваля рабочага руху. Паўстае пытаньне пра сацыяльную базу БНФ. Ужо чэрвеньскі Сойм ва ўхвале заявіў, што Фронт сацыяльна зарыентаваны на беспартыйную большасьць народу Беларусі. У ліпеньскіх дакумэнтах Сойму (Заява ў сувязі з рэгістрацыяй Статуту БНФ) падкрэслена, што БНФ – не палітычная партыя дзеля абароны інтарэсаў сацыяльнае групы, а шырокі народны рух беспартыйных і сяброў дэмакратычных партыяў.

Слова ў спрэчках бралі А.Кулік з Навапалацку, А.Кацапава з Гомелю, З.Абразцоў зь Вілейкі, Л.Баршчэўскі, В.Дамброўскі й М.Чарняўскі зь Менску, А.Фёдараў з Магілёву, іншыя. Гучалі прапановы правесьці ўвосень канфэрэнцыю-сэмінар па палітыцы незалежнасьці пры ўдзеле дэмакратычных партыяў. Ю.Шаўцоў зь Вільні занзначыў, што Фронт мусіць мець прадуманую рэгіянальную палітыку, якая-б улічвала асаблівасьці пэўнага абшару Беларусі. Прыкладам, на Берасьцейшчыне ідзе нечуваны рэлігійны рэнэсанс: тут больш за трэць праваслаўных прыходаў Беларусі, тут і апірышча пратэстанцкіх плыняў. Інфармацыю пра стан у Воршы даў А.Шутаў.

Падчас абмеркаваньня практычных пытаньняў, якія вынікаюць з афіцыйнага юрыдычнага статусу БНФ, было падкрэслена, што рэгіянальныя аддзелы Фронту рэгіструе й надае ім статус юрыдычнай асобы Сойм.

Пасьля кароткага абмеркаваньня была прынятая ўхвала «Да становішча вакол Славеніі й Харватыі». Сойм вырашыў накіраваць за подпісам Старшыні Фронту тэлеграмы салідарнасьці Старшыні Прэзідыюму Рэспублікі Славенія М.Кучану й Прэзідэнту Рэспублікі Харватыя Ф.Туджману.

Сойм пацьвердзіў рашэньне Управы сплніць паўнамоцтвы Генадзя Грушавога як старшыні Камітэту БНФ «Дзеці Чарнобыля». Цяпер працу Камітэту каардынуе Валеры Буйвал.

Наступнае паседжаньне Сойму вырашана правесьці ў верасьні. У сувязі з гэтым В.Вячорка заклікаў сяброў Сойму, усіх фронтаўцаў у канцы жніўня зноў зьвярнуць увагу на школу, стварэньне беларускіх клясаў, на настаўніцкі рух.

Падрыхтавана сакратарыятам Управы.

ДАКУМЭНТЫ

З ЗАЯВЫ Ў СУВЯЗІ З РЭГІСТРАЦЫЯЙ СТАТУТУ БНФ

...Рэгістрацыя Статуту БНФ сьведчыць пра тое, што прапагандысцкая кампанія супраць дэмакратычных сілаў пацярпела ганебны крах. Камуністычныя ўлады вымушаныя прызнаць, што БНФ – не палітычная партыя дзеля абароны інтарэсаў якойсьці сацыяльнае групы, а шырокі народны рух беспартыйных і сяброў дэмакратычных партыяў, мэты якога – усталяваньне дэмакратычнага ладу, адраджэньне культуры, здабыцьцё незалежнасьці Беларусі...

Акт юрыдычнага прызнаньня БНФ – пачатак новага этапу разьвіцьця палітычнае сітуацыі на Беларусі. Суполкі й рады БНФ набываюць законнае права ствараць й дзейнічаць паўсюль, у тым ліку на прадпрыемствах і ва ўстановах – да прыняцьця заканадаўчага рашэньня пра іх дэпартызацыю. Адна з найпершых арганізацыйных задачаў БНФ – стварэньне структураў у кожным раёне Рэспублікі, у кожнай выбарчай акрузе. Толькі пры гэтай умове Фронт зможа належным чынам удзельнічаць у выбарах і рэфэрэндумах. Стварэньне фракцыяў БНФ у мясцовых Саветах дазволіць дзейсна бараніць інтарэсы людзей, спыніць замахі намэнклятуры на дзяржаўную ўласнасьць, дбаць пра нацыянальнае адраджэньне...

ДА СТАНОВІШЧА ВАКОЛ СЛАВЕНІІ Й ХАРВАТЫІ

Мы падтрымліваем і вітаем справядлівую барацьбу славенскага ды харвацкага народаў за свабоду й незалежнасьць.

Імпэрыі перад пагрозаю развалу не выбіраюць сродкаў, каб стрымаць вызвольны рух паняволеных народаў. У Славеніі й Харватыі па віне вялікадзяржаўных мілітарысцкіх сілаў пралілася кроў. Свабодалюбівыя народы ўзьняліся бараніць незалежнасьць ад агрэсара са зброяй у руках. Мы смуткуем разам зь сем'ямі ахвяраў, зычым шматпакутлівым абшарам Славеніі й Харватыі міру й спакою. Але мы добра разумеем, што мір і працьвітаньне тут запануюць толькі тады, калі незалежныя Славенія й Харватыя, прызнаныя міжнароднай супольнасьцю, будуць надзейна гарантаваныя ад імпэрскіх замахаў.

Мы асуджаем пазіцыю савецкае імпэрыі, якая засьведчыла фактычную падтрымку спробы збройнага задушэньня славенскае незалежнасьці. Гэта пацьвярджае, што СССР зьбіраецца надалей душыць сілаю зброі й вызваленчую барацьбу паняволеных Крамлём народаў.

Вітаем паставу заходніх дэмакратычных краінаў, што абвясьцілі эмбарга на продаж зброі Бялграду. Шкада толькі, што такую паставу яны занялі тады, калі пралілася кроў. Няўжо патрэбныя ахвяры для таго, каб заходнія ўрады ўспомнілі, як у свой час змагаліся за незалежнасьць іхнія народы? Няўжо для таго, каб быць заўважаным у сваёй барацьбе за волю й дэмакратыю, паняволены народ мусіць брацца за зброю? Трэба спадзявацца, што славенскі прыклад прымусіць Захад задумацца, ці варта падтрымліваць прагнілыя імпэрскія таталітарныя рэжымы, ці варта весьці да новых кровапраліцьцяў.

Мы-ж будзем браць за ўзор мужнасьць і пасьлядоўнасьць славенцаў і харватаў у мірнай барацьбе за незалежнасьць нашае Бацькаўшчыны.

Менск, 13 ліпеня 1991.

ПРЭС-КАНФЭРЭНЦЫІ

БСДГ наладжвае кантакты з афіцыйнымі прафсаюзамі

20 ліпеня ў Менскім Доме літаратара пасьля сканчэньня пленарнага паседжаньня Цэнтральнае Рады Беларускай Сацыял-Дэмакратычнай Грамады адбылася прэс-канфэрэнцыя на тэму: «Адносіны БСДГ да апошніх палітычных падзеяў у Беларусі й СССР».

На прэс-канфэрэнцыі было адзначана, што БСДГ упершыню наладзіла кантакты з афіцыйнымі прафсаюзамі работнікаў аўтамабільнага й сельска-гаспадарчага машынабудаваньня й радыёэлектроннае прамысловасьці, што ў прафсаюзах шмат прыхільнікаў сацыял-дэмакратаў.

У сувязі з адмоваю ВС БССР прыняць Закон аб прафсаюзах, парлямэнцкая фракцыя БСДГ маркуе вярнуцца да законапраекту, каб высьветліць ягоную адпаведнасьць прынцыпам дэмакратычнага руху, а таксама міжнародным юрыдычным стандартам.

Грамада выказала занепакоенасьць стварэньнем Траўкіным і Шаталіным агульнасаюзнае Аб'яднанае дэмакратычнае партыі, намерамі стварыць Дэмакратычную партыю камуністаў Расеі. Сувязі паміж сацыял-дэмакратамі Беларусі й Расеі наўрад ці патрабуюць узмацненьня, тым болей, што Грамада бярэ ўдзел у працы Дэмакратычнага кангрэсу. Да таго-ж кіраўніцтва БСДГ схільнае да захаваньня пэўнае дыстанцыі паміж Грамадою й АДП СССР, а таксама Дэмакратычнай партыяй камуністаў Расеі.

Наш кар.

СЬВЕТЛАЯ † ПАМЯЦЬ



1948—1991

Управа Сойму БНФ з жалем паведамляе, што 22 ліпеня раптоўна памёр

Эдуард ГРАБОЎСКІ

сябра Сойму БНФ, адзін з пачынальнікаў рабочага руху Рэспублікі, сябра Менскага страйкавага камітэту.

Сьмерць надышла ад вострае сардэчнае нястачы.

Управа Сойму БНФ выказвае спачуваньне бацькам і сям'і нябожчыка, усім родным і знаёмым, усім сябрам Фронту.

КРОНІКА

МАРНАЕ ЛІСТАВАНЬНЕ

***Фэйрфільд (Аўстралія).** Беларускае аб'яднаньне Аўстраліі – старэйшая ў краіне асацыяцыя аўстралійцаў беларускага паходжаньня. Пачынаючы ад жніўня 1990, Генэральны сакратар БАА Аляксандар Алехнік тройчы дасылаў ва ўрад БССР лісты, у якіх падкрэсьлівалася неадпаведнасьць дзяржаўнае сымболікі БССР нацыянальнай беларускай сымболіцы, а таксама залежнасьць ураду Рэспублікі ад «цэнтру».*

У апошнім лісьце, датаваным 25 лютага 1991, сказана: «Я таксама падкрэсьліў пільную патрэбу запэўніць, каб Беларускія дыпламаты служылі толькі й выключна для Беларусі!

Адказу ад Вас, на вялікі жаль, я не атрымаў і, думаючы, што, магчыма, мой ліст загінуў па дарозе, я далучаю фотакопію высланага Вам ліста з просьбаю даць нам тлумачэньне-адказ, які мы будзем зь нецярплівасьцю чакаць».

Як стала вядома рэдакцыі, адказу ад ураду БССР аўстралійскія беларусы не атрымалі, што дало ім падставы трактаваць урад БССР як не зацікаўлены ў дабрабыце й вольнасьці Беларусі. Копіі ўзгаданых лістоў былі перададзеныя ў прэсу з мэтаю апублікаваньня й шырэйшае інфармаванасьці грамадзтва.

ПАСЬВЕДЧАНЬНЕ №131

Зарэгістраваная Канфэдэрацыя працы Беларусі (КПБ), створаная на зьезьдзе незалежных рабочых арганізацыяў, які адбыўся ў Менску 31 сакавіка 1991. Начальнік аддзелу грамадзкіх арганізацыяў Міністу БССР Уладзімір Бандарэнка ўручыў рэгістрацыйнае пасьведчаньне № 131 старшыню выканкаму КПБ Міхасю Собалю.

ПАСЬПЯХОВАЯ АПЭРАЦЫЯ

*У горадзе **Вільстэр (Нямеччына)** была пасьпяхова зробленая апэрацыя Натальлі Горбач. Прычыну хваробы Наташы, якая жыве ў Гародні, спэцыялісты зьвязваюць з Чарнобыльскай катастрофаю. Паездку й лячэньне арганізавалі беларускі дабрачынны фонд «Дзецям Чарнобыля» й нямецкая Мэдычная палата на чале з доктарам Ульрыхам Гардэрам, які апякуе чэрыкаўскі раённы шпіталь. 11 жніўня Натальля Горбач разам з маці вяртаецца дадому.*

НІКОЛІ НЯ ПОЗНА

***Гародня (паводле М.Карнявіча).** Да 1939 вядомы беларускі пісьменьнік М.Карпюк прайшоў камсамольскае падполле ў Заходняй Беларусі, адбываў турэмнае зьняволеньне за спробу ўцёку у СССР. Амаль зь першага дня вайны ваяваў з фашыстамі, трапіў у палон. Пасьля ўцёкаў змагаўся ў шэрагах створанага ім партызанскага атраду імя Каліноўскага.*

Пасьля вайны зьвяртаўся зь лістом у ЦК КПСС, абараняючы калгасьнікаў. На пятым зьездзе пісьменьнікаў Беларусі выступіў у абарону ганьбаванага твору В.Быкава «Мёртвым не баліць». Цкаваньне пісьменьніка працягвалася аж да 1991, пакуль за пакпён на яго ня быў аштрафаваны орган ЦК КПБ «Политический собеседник».

У гэтым годзе ўжо ва ўзросьце 70 гадоў М.Карпюк прыняў рашэньне аб выхадзе з КПСС. У гэтай заяве сказана: «...партыйны білет пакідаю сабе на памяць аб летуценьнях свае маладосьці».

КАНФЭРЭНЦЫЯ РАДЫКАЛАЎ

***Бурштын (Івана–Франкоўская вобл.).** Адбылася канфэрэнцыя руху паняволеных народаў савецкае імпэрыі. У аснове палітычных поглядаў удзельнікаў руху – тэзіс пра расейска-савецкую акупацыю (паняволеньне) народаў СССР. У руху ўдзельнічаюць радыкальныя апазіцыйныя партыі (нацыянальнае незалежнасьці, рэспубліканскія, нацыянальна-дэмакратычныя ды інш.).*

У канфэрэнцыі ўзялі ўдзел прадстаўнікі адпаведных партыяў з Эстоніі, Украіны, Малдовы, Грузіі, Арменіі, Азербайджану, Кыргызстану, Туркменістану, Польшчы, Румыніі. Упершыню ў канфэрэнцыі ўдзельнічаў Дэмакратычны саюз. Старшыня Вышняе Рады Нацыянальна-Дэмакратычнае партыі Беларусі Анатоль Астапенка выступіў на канфэрэнцыі з дакладам пра палітычнае становішча ў Рэспубліцы; у дакладзе, у прыватнасьці, гаварылася, што ў БССР узмацнілася рэпрэсіі супраць удзельнікаў антыкамуністычнага руху, была пададзеная інфармацыя пра арышт В.Сядова. Прамовы іншых удзельнікаў канфэрэнцыі пацьвердзілі, што ў СССР зьявілася тэндэнцыя да актывізацыі антыдэмакратычных сілаў й узмацненьня рэпрэсіяў супраць прыхільнікаў антыкамунізму. У сувязі з гэтым была прынятая ўхвала «Пра палітычных вязьняў усіх рэгіёнаў СССР».

Адбылося таксама паседжаньне Каардынацыйнае рады Варшава-90, падчас якога НДПБ уступіла ў гэтую арганізацыю.

ІМША ПЕРАД ВЫКАНКАМАМ

***Полацак.** 4 ліпеня ў горад прыбыла група пілігрымаў з Польшчы, якія наведвалі мясьціны, зьвязаныя зь дзейнасьцю Баляславы Лямэнт – каталіцкай сьвятой, якая працавала на Беларусі з 1905, апякункі зьяднаньня хрысьціян, заснавальніцы ордэну сёстраў-місіянэрак Сьвятое Сям'і. Дзейнасьць ордэну мела асьветніцкі харатар і была накіраваная на аб'яднаньне праваслаўнае і каталіцкае царквы. Для служэньня імшы мясцовыя ўлады прапанавалі кіназалу, у якой былі адменены сэанс. Замест таго полацкія каталікі адслужылі імшу каля будынку гарадзкога выканкаму, потым – ля Полацкае Сафіі.*

7 ліпеня на нарадзе аб перадачы сьвятыняў вернікам з удзелам міністра культуры БССР і прадстаўнікоў Саўміну ксёндз зь Мёраў Уладыслаў Пятрайціс быў абвінавачаны ў правядзеньні «несанкцыянаванае імшы».



(Працяг са стар. 1)

НА ПАРУКІ НЕ ВЫДАВАЦЬ

20 траўня народны дэпутат Менгарсавету, рэдактар газэты «Навіны БНФ» А.Суша зьвярнуўся ў пракуратуру БССР з просьбаю пад асабістую паруку зьмяніць В.Сядову меру засьцярогі на падпіску пра нявыезд. З аналягічнай просьбаю зьвярнуўся ў пракуратуру й калектыў рэдакцыі «Навінаў БНФ».

10 чэрвеня кіраўнік сьледчае групы пракуратуры БССР В.Собалеў паведаміў рэдакцыі, што «Оснований для изменения меры пресечения Седову В.В. не имеется».

ЛІСТ У ПАСОЛЬСТВА ЗША

12 чэрвеня В.Сядоў перадаў на волю ліст у пасольства ЗША, у якім зьвярнуў увагу на далейшыя парушэньні правоў чалавека ў СССР, перасьлед за палітычныя пераканаваньні. Галоўны акцэнт у ім быў зроблены на нечалавечыя ўмовы ўтрыманьня ў СІЗО, што стала падставаю дзеля дэпутацкага расьсьледаваньня, якое было праведзена народнымі дэпутатамі БССР З.Пазьняком і Я.Новікавым.

ЦІ МОЖНА ПРОЦІСТАЯЦЬ САМАВОЛІ?

12 чэрвеня В.Сядоў напісаў заяву аб пачатку з 14 чэрвеня палітычнае галадоўкі й запатрабаваў мэдычнага кантролю. Адміністрацыя турмы праігнаравала яе. 27 чэрвеня, на 14-ы дзень галадоўкі, калі пра яе ўжо было вядома міжнароднай грамадзкасьці, Валеры быў пераведзены ў карцар. Намесьнік пракурора БССР Ул.Кандрацьеў паабяцаў В.Сядову зьмяніць меру засьцярогі, калі той спыніць галадоўку.

ПАДМАН

28 чэрвеня пасьля спыненьня галадоўкі В.Сядоў быў пераведзены ў камэру, дзе атрымаў жорсткае атручэньне прадуктамі, якое ледзь не прывяло да сьмерці. 1 ліпеня Ул.Кандрацьеў і В.Собалеў заявілі В.Сядову, што ніякае гаворкі пра вызваленьне з-пад арышту не было.

2 ліпеня В.Сядоў аднавіў палітычную галадоўку.

АПАЗІЦЫЯ–ПРАКУРАТУРА. ПЕРАПІСКА

14 чэрвеня З.Пазьняк зьвярнуўся да Г.Тарнаўскага з патрабаваньнем тэрміновa праверыць правамоцнасьць дзеяньняў ст. саветніка юстыцыі В.Собалева, адмяніць пастанову № 257090 ад 7.05.91 і прыняць адпаведныя меры па вызваленьні з-пад варты В.Сядова, узбудзіць крымінальную справу па факце бесчалавечнага абыходжаньня з падсьледнымі ў СІЗО №1.

3 ліпеня Г.Тарнаўскі адказаў, што ўмовы ўтрыманьня В.Сядова правераны, «претензий к администрации следственного изолятора от Седова В.В. не поступило, за исключением жалоб на отсутствие горячей воды и вентиляции, что объясняется объективными причинами. Ваше утверждение о том, что якобы Седову В.В. искусственно созданы условия, угрожающие его здоровью и даже жизни, не соответствуют действительности. Каких-либо фактов «бесчеловечного обхождения» (по Вашей терминологии) с арестованными в следственном изоляторе № 1 Вы не приводите, и подобных фактов при проведении регулярных прокурорских проверок этого учреждения не выявлено. В связи с этим нет и оснований для возбуждения уголовного дела по Вашему обращению».

11 ліпеня народныя дэпутаты ад апазіцыі БНФ падалі Г.Тарнаўскаму вынікі дэпутацкага расьсьледаваньня па фактах парушэньня правоў чалавека ў СІЗО № 1.

16 ліпеня міністар унутраных справаў БССР Ягораў накіраваў З.Пазьняку тэлеграму: «Арестованному Седову В.В. по окончании расследования мера пресечения заключение под стражу прокуратурой БССР изменена на подписку о невыезде с 15 июля с.г. В период нахождения в СИЗО-1 он находился под постоянным медицинским контролем. Жалоб на состояние здоровья комиссии врачей при обследовании 15 июля не предъявлял».

НА ВОЛЮ

12 ліпеня В.Собалеў заявіў В.Сядову, што калі той дасьць распіску аб тым, што азнаёмлены са справаю, мера засьцярогі будзе зьменена падпіскаю пра нявыезд. Змучаны 29-дзённай галадоўкаю, пад пагрозаю «быць згноеным за кратамі», 15 ліпеня В.Сядоў падпісаў справу. Адвакат Валерыя Надзея Дударава ўнесла пратэст з прычыны незаконных дзеяньняў В.Собалева.

ШТО ДУМАЕ ПРАКУРАТУРА?

16 ліпеня В.Собалеў адмовіўся камэнтараваць вызваленьне В.Сядова, матывуючы, што прэса несправядлівая да яго. «Як чалавек, у якога ёсьць пагоны і які ня хоча падаваць рукі ні таму карэспандэнту, ні таму Зянону Станіслававічу», В.Собалеў заявіў: «Калі-б мая была воля, і я яму не абяцаў, ён-бы сядзеў у мяне... У мяне гэтых галадовак за ўсю маю сьледчую практыку было даволі багата. На мяне ня трэба ціснуць. Я ведаю, што раблю».

КАМЭНТАР ЗЯНОНА ПАЗЬНЯКА

Вызваленьне Валерыя Сядова я расцэньваю так: пракуратура й міністэрства ўнутраных справаў адчулі, што над імі навісла небясьпека, што жартаваць з грамадзкай думкаю, з народнымі дэпутатамі й зь міжнароднай грамадзкасьцю для іх небясьпечна. Калі-б гэтае небясьпекі яны не адчувалі, дык ніякай маральлю й ніякім правам яны-б не карысталіся. 73 гады існаваньня сістэмы даказалі, што ні мараль ні права для іх не існуюць.

Першае, што трэба было зрабіць, – гэта вырваць Сядова з гэтае праклятае турмы й выратаваць ягонае жыцьцё. Але гэта толькі першая перамога дэмакратычных сілаў. Цяпер мы ўжо не адмовімся ад гэтай справы, якая была распачатая пад палітычным націскам ЦК. У ёй зроблена столькі прававых парушэньняў, што гэта вымагае адказнасьці. Гэта будзе справа супраць іх.

Што-ж да нежаданьня В.Собалева паціскаць рукі, дык няхай ён лепш паклапоціцца, каб выправілі становішча ў СІЗО. А то як бы яму там не прыйшлося самому сядзець за тое, што адбылося зь Сядовым. Калі-б у нас не было дэпутатаў, не было-б Народнага Фронту, быў-бы іншы час, – згнаілі-б чалавека й сказалі-б, што сам памёр.

Падрыхтавала Ірына ЛАЗОЎСКАЯ.

РЭПРЭСІІ

Семдзесят дзён у СІЗО

Зьмяшчэньне ў сьледчы ізалятар стала для мяне поўнай нечаканасьцю. Таму 7 траўня я прыйшоў у пракуратуру без аніякіх рэчаў. Пасьпеў толькі знайсьці адваката, але мы яшчэ ні словам не перамовіліся пра справу.

Трэба зазначыць, што ў В.Собалева, які прызвычаіўся да старых мэтадаў, алергія на адвакатаў. Нават, калі ён вёз мяне дахаты пасьля галадоўкі й зьмяненьня меры засьцярогі, абураўся, маўляў: законы папрымалі, без адваката ані кроку. Убачыўшы 7 траўня мяне й Надзею Дудараву, ён адразу-ж накіраваў нас у габінэт да В.Кудзіна, адкуль праз гадзіну чаканьня мы накіраваліся да намесьніка пракурора БССР Ул.Кандрацьева. Пачалося высьвятленьне маіх палітычных поглядаў. Асабліва абурэньне пракуратуры выклікаў той факт, што я расеец, а ўдзельнічаю ў БНФ: «Навошта табе гэта? Пакайся, і ўсё будзе добра!»

Я заявіў, што я антыкамуніст. Пасьля гэтага Ул.Кандрацьеў сказаў: «Цяпер я разумею, што сьледчы мае рацыю. У дачыненьні да Вас павінна быць ужытая такая мера як арышт». З габінэта я выйшаў з рукамі «за сьпіну».

І адразу павезьлі ў турму. Бразнуў замок, і пачуўся крык: «Маўчаць! Тварам да сьцяны! Рукі за сьпіну!» Кінулі ў адстойнік, дзе я правёў суткі. На наступны дзень увечары – лазьня й камэра.

Існуе шмат мэтадаў раздушыць вязьня. Усе яны за 70-гадовую гісторыю бальшавізму адпрацаваныя да тонкасьцяў. Пакуль я не магу назваць імёны маіх інфарматараў, бо яны засталіся за кратамі, аднак было-б варта правесьці сацыялягічнае апытаньне сярод зьняволеных на прадмет асаблівасьцяў утрыманьня ў СІЗО, бо адкрыта яны ня скажуць праўды.

Са словаў большасьці вязьняў, сярод мэтадаў уціску ў СІЗО вызначаюцца «гумовая хата» й «прэс-хата» (хата – камэра). «Прэс-хата» – гэта калі вязьня з мэтаю выцягнуць паказаньні садзяць у камэру да зэкаў, якіх адміністрацыя падтрымлівае гарбатаю, наркотыкамі, ільготамі, перадачамі, лазьняю. Яны пачынаюць псіхалягічны й фізічны гвалт над вязьнем. «Гумовая хата» знаходзіцца ў падвале, куды, дарэчы, не пусьцілі Зянона Пазьняка. Яна абабітая гумаю, – адзін чалавек, які сядзеў са мною, гаварыў, што прайшоў празь яе. Ён сьцьвярджаў, што там адміністрацыя ўжывае сілавыя мэтады ўзьдзеяньня на вязьняў.

Яшчэ адзін спосаб узьдзеяньня – карцар, якога мне давялося паспытаць у поўным аб'ёме. Я патрапіў у карцар на 14 суткі галадоўкі:

6.00 – пад'ём, нары зачыняюцца да 22.00.

6.30–7.00 – вывад на ўмываньне й у прыбіральню, які фактычна азначае вынас «парашы». Пасьля мае скаргі мне дазволілі хадзіць у прыбіральню, хаця іншым было адмоўлена ў такім праве. Уявіце сабе чалавека, які не трымае галадоўку, і рэгулярна спраўляе вялікую й малую патрэбу проста ў карцары – ён вымушаны суткі трываць смурод. На ўмываньне даюць ня больш за 3 хвіліны. Зубной пастаю карыстацца забараняюць. Пасьля гэтага прыносяць хлеб, трошкі цукру, гарачую ваду.

8.00 – ранішняя праверка, зьмена наглядчыкаў.

8.30 – каша (дарэчы, да нядаўняга часу ў карцары кармілі толькі праз дзень). Пасьля сьнядку застаешся наглуха замкнёны ў вузкай прасторы: нары зачыненыя, ёсьць толькі маленечкая, памерам з маю руку, умацаваная ў сьцяну жалезная лаўка для сядзеньня.

Многія вязьні спрабуюць сесьці на падлогу. Аднак, калі я сеў на падлогу, прыбег сяржант і сказаў, што зараз-жа нальле на падлогу 10 вёдзер вады. «Калі хочаш, я сам па ваду пайду, – сказаў я яму, – мне хоць прайсьціся будзе нагода». Ці адпавядаюць гэтыя забароны правілам утрыманьня ў карцары, я ня ведаю, бо ўсе мае патрабаваньні азнаёміць зь імі засталіся без адказу. Мяркую, што правілы прыхоўваюцца наўмысна, каб самім вынаходзіць разнастайныя катаваньні. Ня думаю, што ў правілах загадана выліваць ваду ў камэры падсьледных.

Дарэчы, ня толькі ў гэтым парушаюцца ў СІЗО правы падсьледных. У выпадку абвяшчэньня галадоўкі, галадоўшчык павінен быць агледжаны мэдычнай камісіяй, якая мусіць зафіксаваць фізічныя дадзеныя вязьня дзеля таго, каб пазьбегнуць сімуляцыі галадоўкі. Аднак я 14 сутак валяўся ў камэры, і ніводзін лекар не аглядаў мяне. Гэта можна патлумачыць толькі тым, што адміністрацыя турмы рабіла выгляд, што ніякае галадоўкі няма, маўляў, ты дурань, твая галадоўка ня мае ніякага сэнсу – яе не фіксуюць.

Калі насуперак прынятым турэмным начальствам мерам перасьцярогі рэзананс пра галадоўку дасягнуў грамадзкасьці, мяне зьмясьцілі ў карцар. Размова з намесьнікам генэральнага пракурора БССР Ул.Кандрацьевым, які на наступны дзень 28 чэрвеня наведаў мяне ў карцары й паабяцаў зь 1 ліпеня зьмяніць меру засьцярогі, калі я спыню галадоўку, была для мяне самым вялікім узрушэньнем. 15 сутак галадоўкі. Заходзіць намесьнік пракурора Рэспублікі са сваімі абяцанкамі. А я хачу есьці, я хачу на волю. І веру ягоным абяцанкам, спадзяюся на слова гонару. Як сказаў потым у мой адрас вязень з суседняе камэры: «Дурань, мянтам паверыў».

У панядзелак мяне выклікалі, і Ул.Кандрацьеў сказаў, што ніякае гутаркі пра зьмяненьне меры засьцярогі ў нас не было, а толькі пра арганізацыю сустрэчы са сьледчым В.Собалевым. Я зразумеў, што мяне падманулі.

З суботы на нядзелю я еў. Як сказалі мне дактары ў шпіталі, я павінен быў памерці. Я расцэньваю гэты ўчынак Ул.Кандрацьева як сьвядомую спробу зьнішчыць мяне фізічна. Угаворчаючы мяне спыніць галадоўку, Ул.Кандрацьеў і начальнік турмы паабяцалі прызначыць мне ашчадны рэжым харчаваньня, аднак гэта ўсё засталося толькі на ўзроўні абяцанкаў.

А ў камэры апынулася раптам вельмі цьвердая вэнджаная каўбаса, сала, гуркі. Спадзеючыся на тое, што ў хуткім часе мне прынясуць вадкую кашу, камэра адмовілася ад «дачкі» (перадачы), маўляў, зьясі тое, што прынясуць, а потым пакаштуеш каўбаскі.

19.00 – нічога няма. Мне падагрэлі вады, я выпіў яе і зьеў кавалачак вэнджанае каўбаскі, потым другі, трэйці, гурок, кавалачак сала. Усё, больш ня буду. Кладуся на «шконку» (ложак з жалезных лістоў), закрываюся падушкаю, каб ня чуць пахі. Але калі спыняеш галадоўку й здымаеш зь сябе забарону, губляеш кантроль. Чакаў абяцанае кашы – няма, а гэта ёсьць, – і немагчыма трываць двое сутак.

Кожныя паўгадзіны я ўставаў і еў, адчуваючы, як па зьдзервянелым кішэчніку ідзе гэтая жорсткая ежа, драпае. Еў да 23.00. А 3-й гадзіне ночы ўставаў і зноў еў. А 4-й – ізноў. Сну не было. У мяне была толькі адна думка – есьці. Хлопцы пачалі хаваць ежу, трымаць мяне. У мяне пайшлі сьлёзы, і яны кінулі супраціўленьне. Раніцою прыносяць сьнядaнак, я зьядаю дзьве пайкі. Абед ем. Увесь час ем і чакаю пачатку працы страўніка. Іншыя вязьні аддалі мне паўтара кіляграма цукру, пачак масла, пачак маргарыну, гуркі, пару памідораў, сем трускалак. Я ўсё гэта зьеў. У суботу ўвечары наступіў крызіс – разьдзьмуўся жывот, зьмяніўся твар. Я прашу дзяжурную, паклічце мэдсястру. Празь нейкі час наглядчыца вярнулася й перадала адказ мэдсястры: «Чым я магу яму дапамагчы? Няхай рыгае». Я пачаў піць халодную ваду, стала яшчэ горш. Потым хтосьці ўзгадаў, што дзецям робяць клізмы з мыла. Узялі гаспадарчае мыла, разьвялі густы мыльны раствор, і я выпіў яго. Хвілін праз сорак я памачыўся крывёю, і мяне званітавала. Кавалкі ежы выскоквалі са страўніка, нібы з торбы, у якую іх склалі, і яны там валяліся. Гэтак працягвалася да 2-е гадзіны ночы.

Раніцай мне разьвялі гарачую салодкую гарбату, я адчуў цеплыню. Потым разагрэлі маргарын, і я пачаў лыжкаю запіхваць у сябе маргарын, думаў, што атрымаецца эфэкт, як ад змазкі, каб загаіліся раны ў страўніку. Павялі на прагулку. Я ня стаў заставацца ў камэры, бо тады, хто-небудзь з сукамэрнікаў таксама быў-бы пакінуты са мною, а прагулка вельмі шмат азначае для вязьня. Ідучы па калідоры, я заўважыў жанчыну ў белым халаце й зьвярнуўся да яе: «Доктар, я ня маю часу, я галадаў, а ўчора пачаў есьці, і мне вельмі дрэнна, мяне ванітуе крывёю, дапамажыце, дайце слабіцельнае». Ганарліва падняўшы галаву, яна адказала: «Вперёд на мины». Спачатку я не зразумеў, але зэкі растлумачылі мне, што гэта старое турэмнае выслоўе, якое, як і падчас вайны, азначае «ідзі на сьмерць». Так і тут, выжывеш – твая справа, ня выжывеш – напляваць, сьпішуць і ўсё. Так яна й не прыйшла.

Насуперак лёгіцы ў панядзелак нараніцы я ўстаў і пачаў зьбіраць свае рэчы. Прыходзіць наглядчык і пытаецца, а што гэта ты. Ды вось, на волю сыходжу, сам намесьнік пракурора Рэспублікі паабяцаў. Ён сьмяецца. Да паўдня па мяне не прыходзяць, пасьля паўдня таксама. Выклікалі толькі пасьля 17.00. Прывялі ў габінэт начальніка турмы, дзе зноў пачаліся размовы пра камунізм.

Хачу зазначыць таксама – адзінае, што магло стаць падставаю затрыманьня – мой выступ на мітынгу забастоўшчыкаў 23 красавіка, калі я абвясьціў пра стварэньне «Антыбальшавіцкае лігі». Аднак да 1 ліпеня пракуратура ўжо атрымала даведкі з КДБ пра тое, што я ня маю ніякіх узброеных фармазаньняў, а «Антыбальшавіцкая ліга» гэта – гіпатэтычнае ўтварэньне.

Я запатрабаваў адвесьці мяне ў камэру, а на наступны дзень узнавіў галадоўку. Адміністрацыя ведала пра гэта, аднак і цяпер не прыслала лекара для абсьледваньня й не зьмясьціла мяне ў карцар.

У гэты-ж дзень у турме працавала камісія Апазіцыі, ад якое прыхавалі факт мае палітычнае галадоўкі. Раптам у камэру прыйшлі прадстаўнікі адміністрацыі й запатрабавалі, каб я напісаў новую заяву пра галадоўку. Прыйшоў яшчэ адзін капітан, які сказаў, што я галадаю, бо зь мяне зьдзекуюцца сукамэрнікі. Пад выглядам, што іх будуць дапытваць, на 1,5 гадзіны мяне зьмясьцілі ў «стакан».

Потым высьветлілася, што мая ізаляцыя была выкліканая прыходам Зянона Пазьняка й Яўгена Новікава, да якога рыхтавалі вязьняў. З маёй новай камэры, якая разьлічаная на 4-х і ў якой знаходзілася 6 чалавек, аднаго хутка перавялі. Астатніх выклікалі па адным, дапытваліся пра галадоўку, рэкамэндавалі скараціць сапраўдныя тэрміны знаходжаньня ў СІЗО. Аднаму, напрыклад, параілі адказваць, што ён сядзіць не 1,5 года, а 7 месяцаў, пагражаючы пры гэтым карнымі мерамі.

Дэпутатаў да мяне не пусьцілі, затое назаўтра наладзілі сустрэчу з карэспандэнтам урадавае газэты «Рэспубліка», які, як потым мне стала вядома, зьяўляецца асабістым сябрам В.Собалева. Мяркую, што сапраўднай мэтаю гэтага візіту была не публікацыя, а высьвятленьне мае пазіцыі. Акрамя таго, трэба было апраўдаць дзеяньні пракуратуры.

Падчас другое галадоўкі мяне перавялі ў карцар толькі 8 ліпеня, калі пра яе стала вядома народным дэпутатам. Жахлівым катаваньнем стала забарона на цыгарэты. Другое катаваньне – з харчаваньнем, якое па загадзе начальніка турмы пакідалі ў камэры на 2 гадзіны. У мяне пачаліся галюцынацыі. Аднойчы я нібы сабака ўстаў на чатыры кропкі, падпоўз да гэтае міскі й ледзь-ледзь утрымаўся, каб не глытнуць варыва.

Зэкі перадалі мне палову «мойкі» (лязо). Я вырашыў, што калі ня вытрымаю, або пачнуць карміць праз задні праход, ускрыю сабе вены.

Тым часам сярод вязьняў была створаная ініцыятыўная група ў падтрымку майго ліста ў пасольства ЗША. Група распачала падрыхтоўку ўсетурэмнае галадоўкі, адным з патрабаваньняў якой было маё вызваленьне.

Дзесьці на сярэдзіне апошняга тыдня галадоўкі В.Собалеў заявіў мне, што хоча зьмяніць меру засьцярогі, маўляў, узьніклі новыя акалічнасьці: сканчаецца справа й ты мусіш паставіць подпіс, што пазнаёміўся зь ёю. Інакш – турма.

Пры дапамозе сьледчага В.Кудзіна я пачаў паскорана знаёміцца з 16-томнай справаю. Паводле вядомых мне матар'ялаў, 50 сьведкаў паказваюць на мяне, аднак ніводзін не сказаў, што я ўдзельнічаў у масавых беспарадках. Адвакат забараніла мне паддавацца на ўгаворы В.Собалева. Аднак у пятніцу я вырашыў закрыць справу. У панядзелак прыйшоў В.Собалеў і паказаў мне блянкі дакумэнтаў, дзе паведамлялася, што пракуратура зьмяняе меру засьцярогі. Ён сказаў, што вернецца пасьля 15.00 разам з Г.Тарнаўскім, і я атрымаю пастанову аб вызваленьні ў абмен на подпіс пра азнаямленьне са справаю. Я вымушаны быў падпісаць... або застацца ў турме.

Зь СІЗО я амаль адразу трапіў у шпіталь.

Вялікі дзякуй усім, хто падтрымліваў мяне!

Валеры СЯДОЎ.
16 чэрвеня 1991.

На здымку: Валеры Сядоў разам з жонкаю Ірынаю ў 2-м клінічным шпіталі. Фота Ул.Панады.



ДОСЬВЕД

Шлях да «рынкавага заробку»

Малюнак Мікалая ЧАРКАСАВА

Падчас красавіцкіх мітынгаў і страйкаў на Беларусі прагучаў лёзунг «рынкавым цэнам — рынкавыя заробкі». Аўтар гэтага артыкула кандыдат эканамічных навук Любоў Шаламніцкая лічыць, што праблему «рынкавага заробку» ня вырашыць заплянаванае на другое паўгодзьдзе 1991 увядзеньне «новае рэспубліканскае тарыфнае сістэмы» ў вытворчых галінах. Новыя тарыфы «падцягнуць» аплату працы да нядаўна падвышанага ўзроўню ў невытворчай сфэры, а затым, як і раней, давядзецца ісьці па зачараваным коле, г.зн. ізноў вырашаць пытаньні аплаты працы ў галінах аховы здароўя, народнае адукацыі й культуры.

Як разарваць гэтае кола «дзяржаўнае дабрачыннасьці»? Як зрабіць так, каб работнік — уласьнік працоўнае сілы — ня толькі шляхам страйкаў, але й у пэўных канструктыўных формах мог дамовіцца з наймальнікам адносна кошту свае працы?

Дзеля гэтага ў Рэспубліцы павінен існаваць рынкавы мэханізм вырашэньня пытаньняў пра ўмовы працы й аплату. Пры гэтым можа быць выкарыстаны досьвед сацыяльнага партнэрства ў замежных краінах і першы досьвед падрыхтоўкі й заключэньня калектыўных пагадненьняў, які ёсьць у СССР.

У дзяржавах з разьвітай рынкавай эканомікаю бакі, якія заключаюць пагадненьне, — гэта, як звычай, уласьнікі, іх аб'яднаньні (саюзы прадпрымальнікаў) і прафсаюзы як аб'яднаньні працоўных — выразьнікі іхніх інтарэсаў. Пасрэднікам пры перамовах ці іх кіраўніком выступае ўрад, напрыклад, у асобе міністра эканомікі альбо міністра працы.

Тарыфныя структуры функцыянуюць на ўсіх узроўнях — ад верхняга (дзяржаўнага) да фірмы. Адпаведна перамовы вядуцца ў тры этапы. На першым, вельмі важным, этапе перамоваў іх удзельнікі — урад, аб'яднаньні прадпрымальнікаў і прафсаюзы — дамаўляюцца адносна тэмпаў росту заробнае платы. Гэтаму этапу папярэднічае дасканалы аналіз эканамічнае сітуацыі ў краіне. Яна абмяркоўваецца на сходах з удзелам больш шырокага кола прадстаўнікоў ураду й грамадзкасьці. Аб'ект абмеркаваньня — стан эканомікі, пэрспэктывы вытворчасьці, інвэстыцыяў, занятасьці, інфляцыі й магчымы ўплыў умоваў калектыўных пагадненьняў па заробнай плаце на гэтыя працэсы. У выніку падпісваецца гэтак званае «Нацыянальнае Пагадненьне».

«Нацыянальнае Пагадненьне» пра ўзроўні заробнае платы — абавязковая ўмова для прадпрыемстваў усіх формаў уласнасьці, яно дыктуе разглядаць гэтыя ўзроўні як мінімальную аплату ў залежнасьці ад кваліфікацыі работнікаў і складанасьці іх працы. Гэта своеасаблівая гарантыя, але пры ўмове выкананьня заданьня й нормы працы. У тых краінах, дзе існуе закон аб індэксацыі прыбыткаў, пагадненьне падпісваецца звычайна на трохгадовы тэрмін; а, напрыклад, у Нямеччыне ці Аўстрыі, дзе заробак не індэксуецца ў залежнасьці ад тэмпаў інфляцыі, рост цэнаў улічваецца ў заробку шляхам штогадовых пагадненьняў пра падвышэньне зарплаты. Нагадаем, у перамовах бяруць удзел прадстаўнікі ўсіх галінаў вытворчасьці.

На наступным этапе аб'яднаньні ўласьнікаў кожнае галіны й адпаведных прафсаюзаў вырашаюць свае праблемы працы й заробку.

На ўзроўні фірмы прадстаўнікі рабочых і адміністрацыя заключаюць калектыўныя пагадненьні. Большасьць спэцыялістаў і кіраўнікоў працуюць па канкрэтнай сістэме найму. Па сутнасьці, на гэтых узроўнях ідзе сапраўдны гандаль з-за цаны працоўнае сілы й іншых умоваў найму. Пры гэтым аплата працы часта робіцца пэрсаніфікаванай і ўздымаецца вышэй за гарантаваную «Нацыянальным Пагадненьнем». Бакі, якія вядуць перамовы, імкнуцца атрымаць максімальную інфармацыю пра рынак працы. Дзеля гэтага існуюць тарыфныя рэестры, спэцыяльныя цэнтры — клюбы, якія маюць пэўныя зьвесткі пра рынак працы. Вызначаны мінімальны ўзровень заробку, унесены ў выдаткі, павялічваецца ў залежнасьці ад кан'юнктуры рынку, напрыклад, у Нямеччыне ад 6 да 40 і болей працэнтаў.

У нас, на Беларусі й у СССР, існуе практычна адзін наймальнік — дзяржава (калі не лічыць не такія ўжо шматлікія каапэратывы й малыя прадпрыемствы) Адсюль пасьлядоўнасьць заключэньня тарыфных пагадненьняў ідзе зьнізу ўгору. Да разьдзяржаўленьня ўласнасьці ўрад вымушаны выступаць у двух абліччах — наймальніка й гаранта мінімальнае мяжы заробку па кваліфікацыі. На дзяржаву ўскладаецца нялёгкая задача праводзіць цэнтралізаваную палітыку зарплаты, удзельнічаць у рашэньні праблемаў аплаты працы ў кожнай галіне, стрымліваць інфляцыю, непазьбежную пры такой расстаноўцы сілаў. Сітуацыя зьменіцца са зьяўленьнем на рынку працы прыватных уласьнікаў, з удзелам усіх галінаў вытворчасьці ў калектыўных перамовах. Тады ўрад будзе выконваць сваю натуральную ролю — пасрэдніка паміж наймальнікам і прафсаюзам.

Першыя крокі па фармаваньні рынкавага рэгуляваньня цэнаў на рабочую сілу ў СССР ужо зробленыя, але толькі ў тых галінах, дзе прайшлі масавыя працяглыя страйкі. Прыклад — вугальная прамысловасьць. Страйкавыя камітэты шахцёраў падрыхтавалі дакумэнт — Генэральнае пагадненьне паміж урадам СССР і Канфэдэрацыяй незалежных прафсаюзаў гарнякоў, у якім пытаньні падвышэньня заробку вырашаюцца з улікам кваліфікацыі й прафэсіяў рабочых. Сфармулявана патрабаваньне пра сувязь заробку з коштам «спажывецкага кошыка»: з улікам яго долі вызначаецца базавая мінімальная стаўка па кожнай групе рабочых. У дакумэнце прадугледжваюцца суадносіны ў зарплаце, вызначаныя паводле каэфіцыентаў ад 0,8 да 1,3 у залежнасьці ад узроўню кваліфікацыі. Фактычна, у гэтым падрыхтаваным і прынятым па прапанове незалежных прафсаюзаў пагадненьні прадугледжваецца ўзмацненьне дыфэрэнцыяцыі аплаты працы ў залежнасьці ад кваліфікацыі працоўнае сілы й складанасьці працы.

Важна, каб з падобнымі канструктыўнымі праектамі выступілі прафсаюзы ўсіх галінаў вытворчасьці, прычым гэтыя прапановы мусяць быць аб'яднаныя ў часе, каб бакі маглі сумесна вырашаць пытаньні міжгаліновае, міжпрафэсійнае розьніцы ў аплаце працы.

Апрача тарыфна-пагадняльнага мэханізму, трэба мець на ўвазе яшчэ адну вельмі важную акалічнасьць, характэрную для рынкавае эканомікі: заробак павінен складацца з кошту (цаны) працоўнае сілы, выплатаў з прыбытку (якія таксама абумоўліваюцца ў пагадненьнях), а таксама, пры наяўнасьці ўкладаньняў капіталу, выплатаў з прадпрымальніцкага прыбытку. У нашай сістэме аплаты працы ў сувязі з гэтым трэба разабрацца са шматлікімі прэміямі, якія часьцяком не зьвязаныя з вынікамі працы, ня маюць рэальнае крыніцы аплаты. Між тым, у пераходны пэрыяд яны могуць служыць формаю перараьзмеркаваньня прыбытку на асабістае спажываньне, што шкодзіць доўгатэрміноваму разьвіцьцю прадпрыемства.

Такім чынам, працоўныя праз сваіх прадстаўнікоў павінны ўдзельнічаць у вызначэньні цаны свае рабочае сілы пры дапамозе адпаведнага мэханізму. Важнай умоваю дзейнасьці гэтага мэханізму ёсьць існаваньне рэальных уласнікаў: прыватных, калектыўных, дзяржавы й канкурэнцыі паміж імі.

**Любоў ШАЛАМНІЦКАЯ,
кандыдат эканамічных навук.**

ВЁСКА

Яўген ЛУГІН:

РЭСПУБЛІКУ НАКОРМІЦЬ ПРЫВАТНІК

Я.Лугін нарадзіўся ў 1935 у вёсцы Барбарова Глускага раёну Магілёўскае вобл. Да 1986 служыў у войску. Зараз былы падпалкоўнік узначальвае Сялянскую партыю Беларусі.

«Навіны»: У якіх умовах была створаная Сялянская партыя?

Яўген Лугін: Камуністы найбольш пахіснулі свой аўтарытэт тым, што за дзесяцігодзьдзі кіраваньня не накармілі народ. Пасьля звальненьня з войска, я вырашыў вярнуцца на радзіму, каб займацца сельскай гаспадаркаю. Прыехаў у родную вёску, пабудаваў дом, стварыў сельскагаспадарчы каапэратыў. І сутыкнуўся з тым, што на вёсцы адзіная арганізаваная сіла — партыйная намэнклятура ды калгасны апарат, якія выступаюць супраць усялякіх зьменаў. Калі рэформам супрацьстаіць арганізаваная сіла, ёй трэба супрацьпаставіць арганізаваную палітычную сілу — сялянскую партыю.

23 лютага гэтая ідэя ўпершыню прагучала на зьезьдзе Сялянскага Саюзу Беларусі. Потым спатрэбіўся час для падрыхтоўкі Ўстаноўчага зьезду.

«Навіны»: Сялянская партыя — арганізацыя прыватных уласьнікаў зямлі?

Я.Л.: Мы абвясьцілі сваёй мэтаю адраджэньне вёскі, адраджэньне сялянства. Нашая сацыяльная база — уласьнікі зямлі, але ў статуце партыі пазначана: яе сябрам можа быць кожны грамадзянін Беларусі. Мы хочам, каб у гэтую работу ўключыліся ўсе слаі грамадзтва. Мы за прыватную ўласнасьць на зямлю, але не патрабуем тэрміновага скасаваньня калгасаў. Сялянская партыя лічыць, што калгасы павінны зрабіцца тым, чым яны меліся быць ад пачатку — сельскагаспадарчымі каапэратывамі. Іх удзельнікі павінны стаць гаспадарамі на зямлі й самі распараджацца плёнам свае працы.

Сёньня прыблізная лічба прыхільнікаў партыі — звыш тысячы чалавек па ўсёй Рэспубліцы.

«Навіны»: Вы дапамагаеце сялянам атрымаць зямлю й тэхніку?

Я.Л.: Я ведаю шмат людзей, якія атрымалі зямлю менавіта дзякуючы свайму ўдзелу ў СПБ. Мы гаворым людзям так: пішыце заяву ў сельсавет, рэгіструйце й чакайце месяц. Калі праз месяц нічога ня вырашыцца, зьвяртайцеся ў суд. Мы гатовыя аказаць юрыдычную падтрымку.

Пытаньні з тэхнікаю вырашаюцца праз Сялянскі Саюз Беларусі. У адпаведнасьці з рашэньнем Саўміну ён цэнтралізавана атрымлівае сельскагаспадарчую тэхніку й разьмяркоўвае яе.

«Навіны»: СПБ і ССБ — паралельныя арганізацыі?

Я.Л.: Сялянскі Саюз фармаваўся як прафэсійная арганізацыя землеўладальнікаў: фэрмэраў, каапэратараў, арандатараў. Ён створаны дзеля вырашэньня штодзённых пытаньняў. Сялянская партыя — больш палітызаваная арганізацыя. Яна мае мэтаю ня толькі адраджэньне вёскі, але й зьмяненьне дзяржаўнага заканадаўства.

«Навіны»: Вы падтрымліваеце сувязі зь іншымі арганізацыямі падобнага накірунку?

Я.Л.: Існуе Саюз аграрыяў, у якім пераважна прадстаўленыя старшыні калгасаў, дырэктары саўгасаў. Гэтая арганізацыя створаная пры апякунстве КПБ дзеля захаваньня калгасаў і саўгасаў у іх сёньняшнім выглядзе. Гэта — палітыка мінулага дня, падтрымаць якую мы ня можам.

«Навіны»: Якімі Вы бачыце пэрспэктывы разьвіцьця сельскае гаспадаркі Рэспублікі?

Я.Л.: Рэспубліку могуць накарміць толькі сяляне, якія самі гаспадараць на сваёй зямлі. Менавіта за гэта мы выступаем.

**Запісаў Ул.ПАНАДА,
фота К.Войткі.**

ЗА МЕЖАМІ

Армянская рэформа: апора на дыяспару

Саюзны друк і цэнтральная тэлевізія часта падаюць досыць аднабаковыя й недакладаныя сьведчаньні пра становішча ў рэспубліках, асабліва ў тых, якія вырашылі не зьвязваць сябе саюзнай дамоваю. Таму мы вырашылі распачаць сэрыю публікацыяў пра эканамічные й палітычные становішча ў гэтых рэспубліках. Прычым, артыкулы будуць напісаныя «знутры».

Прыватызацыя ўласнасьці ў той ці іншай форме непазьбежная для ўсіх рэспублікаў. Эканамічная рэформа ў Арменіі фактычна пачалася з прыняцьця Закону аб уласнасьці (1 сьнежня 1990), які абвясьціў роўнасьць усіх формаў уласнасьці. У студзені-лютым 1991 была прынятая Пастанова Савету Міністраў пра малыя прадпрыемствы й Закон пра сялянскія й сялянскія калектыўныя гаспадаркі. Паводле гэтага закону, па рашэньні калгасьнікаў калектыўныя гаспадаркі расфармоўваюцца й зямля перадаецца ва ўласнасьць сялянаў. На сёньняшні дзень у шэрагу раёнаў падзел зямлі ўжо скончаны, у іншых яшчэ працягваецца. Пакуль зарана рабіць высновы, але відавочна, што стаўленьне сялянаў да працы карэнным чынам зьмянілася.

**Даведка:
тэрыторыя Армянскае Рэспублікі — 29,8 тыс. км^2. Насельніцтва — 3 млн 350 тыс.
Гарадзкое насельніцтва — 70%.
Армяне — 80%**

Такая радыкальная зямельная рэформа мае й свае адмоўныя бакі. Перш за ўсё з-за скрайняга малазямельля падзел сельскагаспадарчых угодзьдзяў прывёў да значных стратаў зямлі, якая пайшла на межы ды шляхі да надзелаў. Акрамя таго, дробныя надзелы часта ня будуць забясьпечваць сваім гаспадарам дастатковых сродкаў для існаваньня.

Прапаноўваліся й альтэрнатыўныя варыянты зямельнае рэформы, пазбаўленыя гэтых недахопаў, але ў цяперашніх сацыяльных і палітычных умовах урад абраў менавіта гэты шлях, каб у кароткі тэрмін дасягнуць эканамічных і палітычных зьменаў.

Што датычыць прыватызацыі ў гандлі й грамадзкім харчаваньні, дык першыя крокі можна лічыць задавальняючымі. Прыватызацыя 11 крамаў прынесла ў дзяржаўную скарбонку 8 млн рублёў. У выпадках, калі ў прыватызацыйных аўкцыёнах бралі ўдзел калектывы прадпрыемстваў, ім рабілася скідка у памеры траціны ад агульнага кошту.

Цяпер урад рэспублікі працуе над палажэньнем аб дзяржаўных акцыянэрных прадпрыемствах, якія будуць першай спробаю ў справе разьдзяржаўленьня й прыватызацыі ў прамысловасьці. Апублікаваныя ў лютым «Асновы прыватызацыі ў Рэспубліцы Арменія», зыходзячы з тыпу й значэньня аб'ектаў, прадугледжваюць наступныя формы прыватызацыі:

—продаж аб'екту (ці яго часткі) з адначаснай ці растэрмінаванай аплатаю кошту;

—продаж каштоўных папераў;

—безпазыкавая перадача асобных аб'ектаў дзяржаўнае маёмасьці;

—арэнда аб'екту з наданьнем арандатару права пераважнага выкупу аб'екту.

Гаворачы пра праблемы, якія стаяць сёньня перад Арменіяй, у першую чаргу трэба вылучыць наступныя:

—зона бедзтва, якую пакінулі амаль усе будаўнікі «братніх» рэспублікаў, і якой цэнтар «забыўся» выдзеліць 13 млрд рублёў разрэклямаванае на ўвесь сьвет дапамогі;

—становішча (у тым ліку эканамічнае) 200-тысячнага армянскага насельніцтва Нагорнага Карабаху ды суседніх зь ім раёнаў;

—практычна бесьперапынная блякада й рабаўніцтва транспарту, які кіруецца ў Арменію.

Гэтым адмоўным зьявам рэспубліка можа супрацьпаставіць хуткія тэмпы прыватызацыі, супрацоўніцтва з армянскай дыяспараю, традыцыйную працавітасьць і прадпрымальніцкі дух.

Арменія мае вялікія спадзяваньні, зьвязаныя з замежным капіталам. Але калі, напрыклад, Паўднёвая Карэя карысталася дапамогаю ЗША, Міжнароднага банку рэканструкцыі й разьвіцьця, а таксама Міжнароднага валютнага фонду, дык Арменія, падобна, можа разьлічваць пераважна на дапамогу армянскае дыяспары.

У сакавіку 1991 у Лёс-Анджэлясе адбылася канфэрэнцыя, прысьвечаная эканамічнай рэформе ў Арменіі, а ў траўні звыш 200 бізнэсмэнаў-армянаў з 30 краінаў сьвету прыехалі на радзіму, каб наладзіць непасрэдныя сувязі зь мяйсцовымі камэрсантамі. Вынікам канфэрэнцыі стала ўтварэньне Асацыяцыі армянскіх бізнэсмэнаў, у далейшым плянуецца фундацыя Армянскага банку. Сёньня ў Арменіі зарэгістравана каля 50 сумесных прадпрыемстваў, што нельга лічыць дастатковым, улічваючы тое, што іхняя рэгістрацыя зьдзяйсьнялася Міністэрствамі фінансаў і зьнешнеэканамічных сувязяў. Ужо выпрабляюць прадукцыю такія СП, як «Армэнтой» (ЗША) — вытворчасьць лялек, «Апмід—Дыяманд» (Італія) — здабыча натуральнага камяню, вытворчасьць дыямэнтавых прыладаў, «Совюгінбуд» (Югаславія) — праектаваньне, будаўніцтва, «Мікраграф» (Вялікабрытанія) — распрацоўка камп'ютарных праграмаў, «Эрабіён» (Францыя) — вытворчасьць вылічальнае тэхнікі ды інш.

Непрадказальнасьць далейшага разьвіцьця падзеяў у канаючай Савецкай імпэрыі — галоўная прычына асьцярожнасьці замежных прадпрымальнікаў. Як вядома, пасьля землятрусу 1988 па ўсім сьвеце быў зарганізаваны збор сродкаў для аднаўленьня зоны бедзтва. Дагэтуль гэтыя сумы знаходзяцца ў замежных банках і будуць прадстаўленыя толькі пад канкрэтныя праграмы. Міжнародны валютны фонд і Міжнародны банк рэканструкцыі й разьвіцьця таксама выдае пазыкі паводле гэтага прынцыпу. Такім чынам, эканамічная праграма — ня мэта, а неабходны сродак міжнароднага супрацоўніцтва.

Яшчэ адна праблема, зь якой сутыкаюцца ўсе саюзныя рэспублікі — гэта адсутнасьць валюты, без чаго немагчыма спыніць інфляцыю. Варта цэнтру ўключыць друкарскі станок, і ўсе намаганьні рэспублік па стабілізацыі рынку страцяць усялякі сэнс. Невыпадкова балтыйскія краіны ўзялі курс на ўвядзеньне ўласнае валюты. У Арменіі таксама ўсьведамляюць неабходнасьць падобнага кроку, і нават выказваюцца прапановы, што на мяжы 1993—94 будзе магчымае ўвядзеньне ў рэспубліцы ўласнае грашовае адзінкі. Несумненна, што працэс эканамічнага разьмежаваньня рэспублік будзе працягвацца да таго часу, пакуль цэнтар не адмовіцца ад імпэрскіх амбіцыяў ды «сацыялістычных заваёваў». Застаецца толькі спадзявацца, што новую праграму выйсьця з крызісу Г.Яўлінскага не чакае лёс «500 дзён», і што яе канчатковы варыянт будзе ўлічваць інтарэсы ўсіх без выключэньня рэспублікаў. У адваротным выпадку магчымасьць існаваньня Саюзу нават у выглядзе канфэдэрацыі будзе вельмі спрэчнай.

**Арам МЕЛКАНЯН,
Ін-т эканомікі АН Арменіі.**

Ганарар аўтар просіць пералічыць у камітэт БНФ «Дзеці Чарнобыля».



ДАБРАЧЫННАСЬЦЬ

Зноў на Бацькаўшчыне

У чэрвені Беларусь ізноў наведаў Апостальскі візітар для ўсіх беларусаў замежжа айцец Аляксандар Надсон, які адзін зь першых на эміграцыі адгукнуўся на Чарнобыльскую трагедыю нашага народу. Гэта ўжо 4-ы прыезд а.Аляксандра на Бацькаўшчыну.

Сёньня арганізаваныя а.Аляксандрам і асабіста канваяваныя на Беларусь транспарты зь лекамі супроць лейкеміі сталі істотнай дапамогаю мэдыкам Гомельскае й Менскае абласьцей.

На гэты раз ізноў былі прывезеныя вельмі дарагія лекі супроць лейкеміі, шпрыцы й вітаміны. Транспарт каштаваў 15 тысячаў фунтаў і быў разьмеркаваны ў шпіталёх Менску, Хойнікаў, Брагіну й Бараўлянаў.

На думку а.Надсона, становішча ў справе выратаваньня дзяцей ў раёнах Гомельшчыны, у прыватнасьці на Брагіншчыне, пагоршылася. «Там няма будучыні», — сказаў ён. У Менску й Гомелі цяпер намагаюцца пабудаваць мэдычныя цэнтры дзеля лячэньня ахвяраў катастрофы. Аднак у Гомелі гэтая справа пакуль што знаходзіцца толькі на ўзроўні размоваў, і невядома, калі яна будзе рэалізаваная. Тым часам, працэнт хворых вельмі вялікі, няма ня тое, што цэнтру, а нават лекаў. «Калі-б было крыху больш добрае волі, — гаворыць а.Надсон, — дзейнічаць было-б прасьцей, было-б крыху менш камітэтаў і крыху больш супрацоўніцтва».

Не наладжаны адпаведны інфармацыйны абмен зь лекарамі, каб прывозіліся сапраўды патрэбныя рэчы. Часам, людзі, якія арганізоўваюць дапамогу, становяцца ахвярамі недасьведчанасьці й дасылаюць зусім непатрэбнае. «Павінны быць нейкі плян дапамогі, — лічыць а.Надсон. — Мы, напрыклад, падчас разьмеркаваньня дабрачыннага грузу просім у дактароў сьпіс новых патрэбаў і згодна зь ім зьбіраем наступны транспарт. Такім чынам мы не марнуем ні часу ні грошай».

Што датычыцца кантактаў з афіцыйнымі савецкімі ўладамі, дык у гэты раз іх не было з прычыны адсутнасьці часу. А.Надсон сьпяшаецца ў Ангельшчыну, каб яшчэ раз удакладніць, ці ўсё падрыхтавана для прыезду на аздараўленьне беларускіх дзетак. І хаця ў камітэце а.Надсона працуе 5 чалавек, пакуль што асноўны цяжар працы выконвае а.Надсон. Іншыя дапамагаюць наколькі магчыма, вельмі шмат робіць сп.Дзінглі.

Ужо на пачатку ліпеня ў Ангельшчыну прыедзе першая з 6 (78 чалавек) зарганізаваных а.Надсонам, фондам «Дзеці Чарнобыля» й Лігаю жанчын групаў чарнобыльскіх дзяцей. Імі будзе апекавацца Нацыянальная асацыяцыя каталіцкіх сем'яў Ангельшчыны. Дзеці будуць разьмешчаныя па двое пераважна ў шматдзетных сем'ях «Такія аздараўленчыя паездкі, — лічыць а.Надсон, — маюць вялікі плён, паводле словаў брагінскіх мэдыкаў, нават тыднёвы выезд з зоны дае эфэкт».

У Ангельшчыне ініцыятыва а.Надсона карыстаецца вялікай падтрымкаю грамадзкасьці. Аднак дзеля посьпеху ў справе дапамогі ахвярам Чарнобыля патрэбная вялікая праца ў галіне інфармацыі. Калі гэтага не рабіць, людзі ня вераць або забываюць. «Колькасьць ахвяраваньняў павялічваецца пасьля кожнага інтэрвію са мною, — кажа а.Надсон, — пасьля кожнага артыкула».

Наступную дабрачынную паездку на Бацькаўшчыну а.Надсон заплянаваў на канец жніўня.

Разьвітваючыся зь Беларусьсю ён пажадаў суайчыньнікам, «каб Бог перадусім адвярнуў чарнобыльскую бяду, каб на тварах дзетак зьявілася ўсьмешка. Ну а другое, каб нарэшце пачаў дзейнічаць Закон аб мовах».

І.Л.,
фота Ул.Панады.

СПРАВАЗДАЧА

Што адбылося зь «Дзецьмі Чарнобыля»?

У лістападзе 1990 Камітэту БНФ «Дзеці Чарнобыля» фактычна ня стала. Ён ператварыўся ў фонд з аднайменнай назвай. А яшчэ праз пэўны час газэты «Мы и время», «7 дней», «Славянские ведомости» пачалі патрабаваць ад старшыні фонду, народнага дэпутата БССР Генадзя Грушавога фінансавае справаздачы.

ВЫНІКІ ПРАКУРОРСКАЕ ПРАВЕРКІ (З ДАВЕДКІ)

Беларускі дабрачынны фонд «Дзецям Чарнобыля» зарэгістраваны ў Мінюсьце БССР 20 лістапада 1990 пад №5 як грамадзкая арганізацыя.

Заснавальнікамі фонду выступілі 18 фізічных асобаў,.. а таксама Саюз кінэматаграфістаў БССР і «Мікабанк». Устаноўчы фонд не фармаваўся. Усе супрацоўнікі (актывісты) фонду ... працуюць на грамадзкіх пачатках...

Праверка дакумэнтаў на паступленьне дабрачынных грузаў, у асноўным зь Нямеччыны, паказала, што апраўдальныя дакумэнты, пачынаючы з мытнае дэклярацыі, спэцыфікацыяў, актаў прыёмкі грузаў, накладных аб перамяшчэньні й расьпісак ад атрымальнікаў каштоўнасьцяў ёсьць у наяўнасьці. Апроч таго, вядзецца кантрольная кніга, у якой пазначаецца дата й адпраўшчык грузу, характарыстыка грузу, адрас атрымальніка. Ад нямецкага боку як асноўнага адпраўшчыка дабрачыннае дапамогі ў памяшканьні фонду на вул. Старавіленскай, 14 знаходзіцца сталы прадстаўнік, які пэрыядычна зьмяняецца нямецкім бокам...

Дабрачынныя грузы, што праходзяць церазь Менск транзітам і прызначаныя насельніцтву Берасьцейскае, Гомельскае, Магілёўскае й Менскае абласьцей, разьмяркоўваюцца на мейсцах грамадзкімі фармаваньнямі фонду пад кантролем нямецкага боку...

Разам з тым, дакумэнты, што характарызуюць рух грузаў, афармленыя зрэдку неахайна, прозьвішчы канкрэтных атрымальнікаў не заўсёды расшыфраваныя, часам адсутнічае пячатка ці штамп.

У фондзе лічацца бясплатна перададзеныя нямецкім бокам: адна легкавая машына, два аўтобусы тыпу РАФ, адзін грузавы аўтамабіль, чатыры друкавальныя машынкі, шэсьць з паловаю сталоў (2,5 тыс. DM), 11 крэслаў (1,6 тыс. DM), фотакапіравальны апрат (4 тыс. DM), 5 настольных лямпаў (225 DM), відэамагнітафон «Панасонік» (1,2 тыс. DM), мэбля дзеля сядзеньня з мэталічнымі каркасамі — 7 штук (360 DM)...

Праверкаю за сакавік—травень бягучага году ўстаноўлена, што дабрачынныя грашовыя ўнёскі (ахвяраваньні) ад арганізацыяў і грамадзянаў паступілі ў суме 646.738 руб., апроч таго на ўтрыманьне фонду 20.885 руб. («Мікабанк» — 120.000 руб., НТЦ «Імпульс» — 15.000 руб., Столінскае хлебапрыёмнае прадпрыемства — 1.250 руб., СОС КІНДЭРДОРФ — 10.000 руб. — на ўтрыманьне фонду, арганізацыі КЭР (Германія), з Ульянаўску — 70.000 руб., Гародні, Мазыра — 5.000 руб., Магілёўскае абласное аддзяленьне Савецкага дзіцячага фонду — 90.000 руб. і г.д.).

Азначаныя сродкі выдаткаваныя на набыцьцё квіткоў па перавозцы дзяцей — 241.345 руб., гаспадарчыя выдаткі — 200 руб., аплату за пражываньне ў гатэлі замежных прадстаўнікоў — 4.702 руб., тэлефакс — 11.046 руб., іншыя выдаткі: бэнзін, мытня, рэгістрацыя аўтатранспарту, устаноўка сігналізацыі — 8.800 руб...

Усяго за сакавік—травень бягучага году на рахунак фонду паступіла на дабрачынныя мэты 646.738 руб., выдаткавана на гэтыя мэты 241.344 руб. (37,3%), альбо паступленьні перавысілі выдаткі на 405.395 руб.

На ўтрыманьне фонду паступіла 20.885 руб. і выдаткавана 33.061 руб. (альбо 187,3%), выдаткі перавысілі паступленьні на 12.176 рублёў. Усе азначаныя выдаткі зьвязаныя з абслугоўваньнем дабрачыннае дзейнасьці.

Фонд мае валютны рахунак у Зьнешэканомбанку СССР. Усяго на гэты рахунак за пэрыяд існаваньня фонду паступіла 23.528 інвалютных рублёў, у тым ліку 5,7 тыс. $ ЗША й 9.980 DM. ... З азначаных сродкаў выдаткавана 12 чэрвеня 1991 — 3,5 тыс. інв. руб. на аплату праяздных дакумэнтаў для дзяцей з г.Ветка, накіраваных на аздараўленьне ў ЗША, і 12 ліпеня 1991 — 7,4 тыс. інв. руб. на аплату праяздных дакумэнтаў для дзяцей з Мазыру й Пінску, накіраваных на аздараўленьне ў Канаду. Рэшта ў 12,6 тыс. інв. руб. лічыцца на рахунку ў банку...

За час дзейнасьці фонду (8 месяцаў) накіравана на лячэньне ў замежныя клінікі болей за 40 дзяцей дашкольнага й школьнага ўзросту. На аздараўленьне з зоны падвышанае радыяцыі з шматдзетных і малазабясьпечаных сем'яў — болей за 8000 дзяцей.

Атрымана й разьмеркавана болей за 250 тонаў дабрачынных грузаў... У лістападзе 1991 створаная пры фондзе рэвізійная камісія будзе праводзіць рэвізію.

Гал. спэцыяліст-кансультант пракуратуры г.Менску А.Якаўлеў.

З РАШЭНЬНЯ ЎПРАВЫ БНФ (ад 24 чэрвеня 1991)

У сувязі з тым, што старшыня Камітэту БНФ «Дзеці Чарнобыля» Генадзь Грушавы стварыў незалежны й непадсправаздачны Сойму ды Ўправе БНФ фонд «Дзецям Чарнобыля», заняты працаю ў фондзе й фактычна спыніў выкананьне абавязкаў старшыні Камітэту БНФ «Дзеці Чарнобыля», лічыць паўнамоцтвы Г.Грушавога як старшыні гэтага Камітэту БНФ спыненымі.

Даручыць сябру Сойму ды Ўправы БНФ Валерыю Буйвалу каардынаваць працу па абнаўленьні складу й формаў дзейнасьці Камітэту БНФ «Дзеці Чарнобыля»...

13 ліпеня 1991 Сойм БНФ пацьвердзіў гэты дакумэнт, а таксама ўхваліў рашэньне аб распрацоўцы новае канцэпцыі арганізацыі, працы й дзейнасьці Камітэту «Дзеці Чарнобыля».

КАМЭНТАР ЮРЫЯ ХАДЫКІ

Дзейнасьць Камітэту БНФ «Дзеці Чарнобыля» на працягу апошняга году ўсё больш скіроўвалася ў напрамку, які вызначаўся створаным пры Камітэце дабрачыным фондам «Дзецям Чарнобыля». Гэта быў збор грошай для адпраўкі дзяцей на аздараўленьне за межы Беларусі. Адыйшлі ў цень шмат якія іншыя накірункі дзейнасьці, заплянаваныя ў час стварэньня Камітэту. Сп. Г.Грушавы, які адначасна ўзначальваў і Камітэт і фонд, паступова заняў пазіцыю, цалкам незалежную ад палітыкі, якую праводзіць па пытаньні выратаваньня нашага народу ад чарнобыльскае бяды Народны Фронт. Вялікая самастойнасьць, якую набыў фонд, а таксама адмова рабіць фінансавыя справаздачы перад Управаю БНФ і выклікалі гэтыя рашэньні.

Управа й Сойм БНФ лічаць неабходным вярнуцца да першапачатковае ідэі Камітэту «Дзеці Чарнобыля», дзейнасьць якога павінна быць скіраваная на актывізацыю працэсаў перасяленьня з забруджанае зоны, юрыдычную й мэдычную абарону ахвяраў радыяцыі, а не выключна толькі на кампаніях па вывазе дзяцей за мяжу.

ЧАРНОБЫЛЬСКІ ТРЫБУНАЛ

Ангельскія ахвяры радыяцыі падаюць у суд

На 2-м Чарнобыльскім Трыбунале беларускі юрыст Сяргей Вінаградаў прапанаваў асобам, пацярпелым ад Чарнобыльскае катастрофы, прад'явіць судовыя іскі з патрабаваньнем кампэнсацыі за пашкоджанае здароўе, панесеныя маральныя й матар'яльныя страты да ЦК КПБ — органа, які ў час катастрофы й пасьля яе фактычна кіраваў Рэспублікаю. Прэцэдэнт падобнх іскаў у сьвеце ёсьць. Гэта іскі чатырох ангельскіх сем'яў, якія жывуць паблізу ад Сэляфільдзкае АЭС да кампаніі «British Nuclear Fuels».

Ужо колькі разоў задавалася пытаньне, хто-ж нарэшце адказа за тое, што здарылася на беларускай зямлі, за тыя наступствы, якія штодня нябачнай рукою насьцігаюць ня толькі дарослых, але й дзяцей, якіх ангельская газэта «Daily Telegraph» у сёлетнюю гадавіну катастрофы назвала «паддосьледнымі сьвінкамі ў лябараторыі сьмерці». Пакуль што апрача кіраўніцтва Чарнобыльскае АЭС да адказнасьці не прыцягнуты ніхто, нягледзячы на перадвыбарчыя абяцаньні многіх народных дэпутатаў БССР. Больш таго, у забруджаных раёнах, усьведамляючы скрайнюю небясьпеку наступстваў Чарнобыля, па-ранейшаму жывуць людзі, п'юць малако ад кароваў, выгадаваных на радыяактыўных кармох.

Падчас 2-га Чарнобыльскага трыбуналу, які сёлета 27 красавіка па ініцыятыве БНФ быў праведзены ў Менску, прагучала прапанова прад'явіць судовыя іскі да ЦК КПБ, на якім як вышэйшым органе тады яшчэ заканадаўча кіраўнічае партыі, ляжыць увесь цяжар адказнасьці за радыяцыйны генацыд беларускага народу. Як высьветлілася, гэтая прапанова не зьяўляецца беспрэцэдэнтнай. Ангельскія ахвяры мірнага атаму ўжо падалі судовыя іскі супраць уладальнікаў атамнае кампаніі «British Nuclear Fuels».

З 1983 у Брытанскім каралеўстве вядуцца дасьледваньні па ўзьдзеяньні ядзерных рэактараў на здароўе людзей і, у прыватнасьці, дзяцей, якія пражываюць у населеных пунктах побач з атамнымі станцыямі. У заходняй частцы краіны, дзе каля гарадка Сэляфільд разьмешчаны атамны рэактар кампаніі «British Nuclear Fuels», спэцыяльная камісія навукоўцаў у складзе прафэсара мэдычнае статыстыкі Мартына Дж.Гарднэра, радыятэрапэўта Майкла П.Сьні, эпідэміёляга Эндру Дж.Хола, былога галоўнага лекара Сэляфільдзкага раёну Джона Д.Тэрэла, навуковых супрацоўнікаў Каралін А.Паўэл і Сьюзэн Даўнэз прааналізавала прычыны ўзьнікненьня лейкеміяў і лімфомаў сярод моладзі й дзяцей. Ангельская філія арганізацыі «Greenpeace» перадала рэдакцыі «Навінаў БНФ» дакумэнты, у якіх зьмешчаныя вынікі згаданых дасьледваньняў. У Ангельшчыне яны былі апублікаваныя 17.02.1990.

За апошнія 15 год у Сэляфільдзе рызыка ўзьнікненьня паталёгіі цяжарных павялічылася ў 7 разоў. У радыюсе 5 кілямэтраў ад Сэляфільду ў параўнаньні зь сярэдняй па Брытаніі лічбаю захворваньняў на лейкемію й лімфому колькасьць гэтых захворваньняў няспынна павялічваецца. Адна з красамоўных табліцаў, у якой улічаныя практычна ўсе фактары (ад уплыву на арганізм рыбных прадуктаў да небясьпекі, якую ўтрымлівае гульня дзяцей у полі альбо на пляжы) паказвае, што сярод тых, хто, напрыклад, вырошчваў у Сэляфільдзе гародніну й ужываў яе ў ежу, колькасьць лейкеміяў вырасла ў 20 разоў.

У дасьледваньнях прымаўся да ўвагі й такі фактар, як мейсца працы бацькоў. Было даведзена, што на іх усіх у большай ці меншай ступені радыяцыя ўзьдзейнічала на працягу 7 гадоў. Адна з самых страшных высноваў камісіі сфармуляваная наступным чынам: «Уплыў радыяцыі на генны апарат прыводзіць да мутацыі спэрмы, што робіцца прычынаю захворваньня на лейкемію яшчэ ненароджанага дзіцяці».

Калі чалавек знаходзіцца ў зоне з падвышанай радыяцыяй больш за 6 месяцаў, дык гэтая небясьпека становіцца рэальнасьцю. Павялічваецца таксама рызыка ўзьнікненьня хваробы Даўна.

Падобныя дасьледваньні праводзіліся таксама й у іншых раёнах Англіі, дзе дзейнічаюць атамныя рэактары, і паўсюль вынікі былі амаль аднолькавыя. Прычым дзеці, якія нарадзіліся ў гэтых раёнах, рызыкуюць больш чым тыя, якія прыехалі сюды пазьней і наведваюць мяйсцовыя школы.

Паводле ангельскіх навукоўцаў, крытычны пэрыяд знаходжаньня ў небясьпечных зонах — 7 гадоў.

Нядаўна ў ангельскіх газэтах зьявілася сэнсацыйнае паведамленьне пра тое, што 19 дзяцей, якія жывуць у радыюсе 20 міляў ад Сэляфільдзкага рэактара, захварэлі на лейкемію, і што іхнія бацькі маюць намер судзіцца з кампаніяй «British Nuclear Fuels» на прадмет кампэнсацыі за нанесеную здароўю дзяцей шкоду. Чатыры пацярпелыя сям'і далі інтэрвію часопісу «Observer». Вось тыповая гісторыя аднае зь іх.

Сям'я дэ Кардова пераехала на сталае жыхарства ў ваколіцы Сэляфільду. Іхняя дачка Элі памерла ў 1986 за тыдзень да свайго пятага дня нараджэньня ад лімфатычнае лейкеміі. Яна жыла разам зь дзецьмі, якія таксама хварэлі. Яе сябра Робэрт памёр за год да сьмерці Элі. Дзяўчынка была на пахаваньні, і яна радавалася, што душа Робэрта адыйшла да Бога. У сям'і ёсьць яшчэ двое дзяцей, узрост — 19 і 6 месяцаў. Містэр і місіс дэ Кардова заявілі, што ў памяць свае дачкі будуць змагацца ў судзе супроць атамнае кампаніі.

Прыблізна такая-ж гісторыя адбылася й зь сям'ёю Мар. Місіс Мар павяла свайго пяцігадовага сына Рональда да лекара з нагоды моцнага болю ног і агульнае слабасьці, якая ніяк не праходзіла. Дыягназ «рак» быў стрэсам для ўсяе сям'і. Праз тры месяцы пасьля таго, як ён быў пастаўлены, жанчына прачытала нязвыклую аб'яву ў мяйсцовай газэце «Whitehaven news»: «Калі вашае дзіцё хварэе на лейкемію, калі вы жывяце недалёка ад Сэляфільду, калі вы жадаеце падаць у суд на кампанію «British Nuclear Fuels», дык чаму-б вам не патэлефанаваць да нас?» Тэлефон належаў лёнданскаму адвакату Мартыну Дэю, які прадстаўляў ужо дзесяць сем'яў з Сэляфільду ў справе па атрыманьні кампэнсацыі. Ён — сябра камітэту «Ахвяра радыяцыі», у які ўваходзяць юрысты, лекары й навукоўцы, якія абараняюць інтарэсы пацярпелых. Пасьля таго як адвакат зьмясьціў сваю аб'яву, за кароткі тэрмін да яго зьвярнуліся яшчэ 22 сям'і.

Як адзначае часопіс «Observer», калі М.Дэй пераможа ў гэтай справе, ён трапіць у гісторыю сусьветнае юрыспрудэнцыі. Кампанія, супраць якой узбуджана справа, ужо выплаціла каля 500 000 фунтаў удовам работнікаў, якія загінулі на вытворчасьці, але ніколі ні шылінгу не дала тым, хто проста жыве побач з прадпрыемствам й падпадае пад яго нябачнае ўзьдзеяньне.

Адвакат М.Дэй зьбіраецца пачаць з чатырох сем'яў, дадзеныя якіх найбольш красамоўныя. Мэдычным экспэртам стаў ангельскі прафэсар Э.Рэтфард, які ў ЗША быў экспэртам па ўздзеньні радыяцыі й вывучаў стан ахвяраў Хірасімы. Ён мяркуе, што існуюць тры прычыны лейкеміі. Першая — ад выкідаў радыяактыўных рэчываў у атмасфэру, што непасрэдна ўплывала на людзей, ежу й напоі. Другая — непаўнацэннасьць генаў бацькоў, якія трапілі пад ўздзеньне радыяцыі. Трэйцяя прычына — непасрэдны ўплыў радыяцыі на дзяцей ад забруджанага адзеньня ды скуры бацькоў, якія не прайшлі адпаведнае апрацоўкі пасьля знаходжаньня ў зоне рэактара.

Пакуль невядома, чым скончыцца гэты працэс, але відавочна: чалавек мае права патрабаваць маральнае й матар'яльнае кампэнсацыі ад кампаніі, а ў савецкіх умовах ад ураду-манапаліста й КПБ-КПСС за нанесеную шкоду. Толькі трэба, каб знайшоўся сьмелы юрыст, які зьмесьціць сваю аб'яву ў газэце (прапануем нашую) і паспрабуе заклікаць да адказнасьці тых, хто вінаваты перад нацыяй за Чарнобыльскі генацыд.

**Тацьцяна КІРЫЛАВА,
кандыдат філялягічных навук.**

P.S. Рэдакцыя ўдзячная карэспандэнту лёнданскае газэты «The Times» Бобу Сілі за пасрэдніцтва ў справе атрыманьня інфармацыі.



ПОГЛЯД

Юры ТУРОНАК

Ці быў справядлівы ў Садоме?

(Працяг. Пачатак у №4'1991)

Фотаздымак і подпіс з часопісу «Новы шлях» (№13'1943)

Імкненьне Кубэ да стварэньня рацыянальнага грунту функцыянаваньня цывільнае адміністрацыі шляхам узгадненьня інтарэсаў акупантаў і акупаваных было спрэчным з пазіцыяў Гімлера й выклікала яго вострую рэакцыю. Ён адкінуў прапанову падпарадкаваньня цывільным уладам усёй гаспадаркі Беларусі, заўважыўшы, што «спадар Кубэ, які толькі два месяцы служыў у войсках СС як вартаўнік, ня мае ўяўленьня пра салдацкія справы, пра дапамогу войску й яго забесьпячэньне». Адносна адказнасьці за зьнішчэньне й рабаваньне твораў мастацтва ягоны вэрдыкт гучаў так: «Прашу на ўсе часы спыніць з боку спадара Кубэ такое нахабства». Неўзабаве ў вачох Гімлера, СС і вэрмахту Кубэ атрымаў рэпутацыю «прыяцеля габраяў». Такім чынам, ужо ў канцы 1941 г. акрэсьлілася варожасьць паміж Кубэ й Гімлерам зь ягоным магутным ведамствам, што мела цяжкія наступствы.

Ацэньваючы дзейнасьць акупацыйнага рэжыму ў першую гадавіну яго ўтварэньня, Кубэ адзначаў, што па той прычыне, што ён атрымаў ад вэрмахту й СС толькі «малыя рэшткі гаспадаркі», асноваю яго дзейнасьці на Беларусі была рэалізацыя «заданьняў палітычных». І хоць ён меў шматгадовы досьвед у гэтай галіне, аднак, на Беларусі апынуўся перад задачаю, якую акрэсьліў як беспрэцэдэнтную (erstmalig). Край, куды накіраваў яго Гітлер, быў вельмі асаблівы: без традыцыяў нацыянальнае дзяржаўнасьці, зь няпэўнымі межамі, апрача таго, складзены з абшараў, якія ў міжваенны час уваходзілі ў склад СССР і Польшчы, з чаго вынікаў розны характар іх грамадзка-палітычных структураў. Гэтыя акалічнасьці абумовілі моцныя ўплывы расейскае й польскае культураў і слабасьць сэпаратысцкіх імкненьняў.

Кубэ невыпадкова адзначаў: «Беларусь была перад усім у літаральным значэньні гэтага слова ня больш чым імглістым паняцьцем геаграфічным». Паліцэйскія справаздачы зь Беларусі, якія ішлі ў Бэрлін, фактычна пацьвярджалі ранейшы скептыцызм Розэнбэрга адносна народнага патэнцыялу беларусаў. Невыпадкова блізкі да ведамства Розэнбэрга пэрыёдык «Deutche Post aus dem Osten» адзначаў у лістападзе 1941: «Увогуле будучыня беларускае, ці крывіцкае, нацыянальнасьці стаіць пакуль што пад знакам пытальніка, а на думку скептыкаў зьяўляецца нават цалкам няпэўнай... Трэба высьветліць, ці беларуская, альбо крывіцкая, нацыянальная праблема знойдзе цяпер сваё вычарпальнае вырашэньне».

Такім чынам, шмат што ўказвае на тое, што дзейнасьць Кубэ на Беларусі была трактаваная Розэнбэргам як палітычны экспэрымэнт, вынікі якога маглі-б быць выкарыстаныя пры вызначэньні статусу гэтага краю пасьля спадзяванае перамогі над СССР. Указвае на гэта таксама Пэтэр Кляйст, былы начальнік аддзелу Остлянд у Міністэрстве па перасяленьні з Усходу, які пасьля вайны пісаў , што заданьне Кубэ грунтавалася на «ачышчэньні» Беларусі ад расейскіх і польскіх уплываў, а таксама на чаканьні рашэньня Бэрліну, якое датычыла будучыні гэтае часткі «перадтэрыторыі» Райху. Скептыцызм Розэнбэрга ў адносінах будучыні беларускага народу й адсутнасьць зь ягонага боку канкрэтных дырэктываў давалі Кубэ магчымасьць праяўляць уласныя ініцыятывы.

У адрозьненьні ад Эрыха Коха (генэральны камісар Украіны – Рэд.), які на Украіне зьбіраўся кіраваць «з дапамогаю гарэлкі, махоркі й бізуна», Кубэ запэўніваў, што асаблівую ўвагу ён аддасьць «пільнаваньню» беларускае культуры. Першым ягоным нарматыўным актам у гэтай справе было выданьне 10.09.1941 пастановаў пра школьніцтва, якія ўводзілі абавязковую адукацыю для ўсіх, акрамя габрайскіх дзяцей, ва ўзросьце ад 7 да 14 год і абавязвалі мяйсцовую адміністрацыю адчыняць з 1.10.1941 пачатковыя школы з наступнай праграмаю навучаньня: родная мова, прыродазнаўства (батаніка й заалёгія), арыфмэтыка, геаграфія, сьпевы, праца, гімнастыка. Навучаньне праваслаўнай і каталіцкай рэлігіі не магло адбывацца па-за школаю. Пастановы рабілі націск на выхаваньне моладзі ў духу гітлераўскае Новае Эўропы й пагражалі суровымі карамі за выкарыстаньне школаў для распаўсюджваньня савецкае й польскае ідэялёгіі. Догляд за дзейнасьцю школаў ажыцьцяўляў генэральны камісарыят у Менску й акруговыя камісарыяты, у якіх былі створаныя беларускія школьныя інспэкцыі. На другім годзе акупацыі пачалі працаваць: сярэднія агульнаадукацыйныя школы, мэдычны інстытут у Магілёве, а таксама Беларускае навуковае таварыства ў Менску. Быў створаны Саюз беларускай моладзі (СБМ), які ў канцы акупацыі яднаў каля 100 тысячаў сяброў, была разьвітая культурная дзейнасьць, беларусізавалася адміністрацыя, цэрквы й касьцёлы. Акрамя таго, Кубэ меў намер стварыць краёвыя прадстаўнічыя органы ў выглядзе Беларускае Народнае самапомачы й Камітэту даверу.

Кубэ разумеў, што пры злачынных адносінах СС і паліцыі да цывільнага насельніцтва ў працэсе супрацьпартызанскіх акцыяў усе ягоныя пазітыўныя дзеяньні могуць мець хіба што вельмі абмежаваны грамадзкі рэзананс. З гэтае прычыны, як таксама, магчыма, з гуманістычных намераў, ён распачаў барацьбу з СС у абарону бязьвіннага насельніцтва. Ня маючы магчымасьці загадваць паліцэйскім уладам, Кубэ выяўляў злачынствы карных аддзелаў і імкнуўся інфармаваць пра іх Розэнбэрга й Гітлера, наіўна спадзеючыся на выніковасьць сваіх захадаў. З гэтай мэтаю ён скіраваў акруговым камісарам сакрэтны цыркуляр, у якім патрабаваў падрабязных зьвестак пра дзейнасьць паліцэйскіх фармаваньняў.

24.3.1943 праз райхскамісарыят Остлянд Кубэ выслаў Розэнбэргу рапарт камісара Менскае акругі Людвіка Эрэнляйтнэра, які нейкі час замяняў камісара Слонімскае акругі, дзе былі пададзеныя канкрэтныя вынікі праведзенае ў гэтай акрузе Готбэргам пацыфікацыйнае акцыі «Гамбург–Альтона». У рапарце гаварылася пра вынішчэньне й вывязеньне ў Райх вясковага насельніцтва й сьцьвярджалася, што акцыя аказалася беспасьпяховаю, бо на «супакоеных» абшарах партызанскі рух ня толькі аджыў, але й узмацніўся за кошт таго, што ў шэрагі партызанаў уліліся ахопленыя жахам людзі. Тым самым Эрэнляйтнэр пацьвердзіў меркаваньне Кубэ, што адны паліцэйскія акцыі ня ў стане вырашыць праблему партызаншчыны. Гэта быў, бадай, першы рапарт такога роду. Ён выклікаў вялікую заклапочанасьць сярод чыноўнікаў райхскамісарыяту Остлянд – яго разглядалі амаль два месяцы ў «чатырох розных установах» й мелі намер нават вярнуць яго Кубэ, і толькі ў выніку рашэньня райхскамісара Лёзэ рапарт у канцы траўня быў перасланы ў Бэрлін.

Рапарт Эрэнляйтнэра распачаў сэрыю абвінавачваньняў СС у злачынным стаўленьні да мірнага насельніцтва. На падставе рапартаў, якія складаліся, між іншым, працаўнікамі генэральнага камісарыяту ў Менску, Кубэ паведамляў вышэйшым уладам канкрэтныя факты. Паводле аднаго зь іх, у якім была выкарастаная інфармацыя Юліяна Саковіча, камэнданта беларускае паліцыі ў Менску, Кубэ дакладваў пра выпадкі, калі карныя аддзелы зганялі жыхароў вёсак у дамы й спальвалі жывымі. Прыводзіў таксама выпадкі, калі ў шпіталі ў пошуку мэдычнае дапамогі дастаўляліся недастрэленыя людзі, якія выбраліся з магілы. Шматразова зьвяртаўся ў сувязі з акцыяй «Котбус». 5 чэрвеня паведамляў, што сярод 5000 забітых па прычыне супрацоўніцтва з партызанамі шмат жанчын і дзяцей, што прыводзіць да катастрафічных палітычных вынікаў. 29 чэрвеня, маючы ўжо поўныя вынікі гэтае акцыі, Кубэ пісаў Розэнбэргу, што пад час яе было забіта 13000 «ворагаў», пры гэтым здабыта толькі 950 вінтовак, з чаго рабіў выснову, што 90% гэтых «ворагаў» наогул ня мелі зброі.

«Прапаную, – пісаў Кубэ да Лёзэ яшчэ 3 чэрвеня, – папрасіць міністра акупаваных усходніх абшараў прадставіць гэтую справу ў Галоўнай кватэры Фюрэра. Калі такія, як дагэтуль, адносіны да мяйсцовага насельніцтва будуць працягвацца, і ня толькі з боку паліцыі, але й з боку вэрмахту й карных аддзелаў, дык у наступную зіму мы можам чакаць ня толькі партызанаў, а бунту ва ўсім краі». У іншым лісьце ад 14 чэрвеня Кубэ ўказваў на адказнасьць фон Готбэрга як кіраўніка пацыфікацыйных акцыяў, якія, маючы катастрафічныя палітычныя й эканамічныя вынікі, ня толькі не спрыяюць зьмяншэньню партызанскага руху, але, наадварот, спараджаюць ягоны рост.

Ў абарону насельніцтва выступіў таксама Камітэт даверу, які сабраў факты рэпрэсіўнае дзейнасьці карных аддзелаў ва ўсіх акругах Генэральнага камісарыяту Беларусі й сярод іх рапарт палкоўніка Францішка Кушаля аб ходзе пацыфікацыйнае акцыі «Герман» у Пяршайскай гміне Валожынскага павету ў другой палове ліпеня, пад час якой былі спаленыя жывымі, разам з пабудовамі, жыхары дзесяці вёсак.

23.08.1943 падчас скліканай Кубэ сумесна зь нямецкімі цывільнымі й паліцэйскімі ўладамі сэсіі, Камітэт даверу прадставіў гэтыя факты, пратэстуючы супраць падобных дзеяньняў карных аддзелаў. Адначасова Камітэт зьвярнуўся да нямецкіх уладаў з просьбаю аб:

1) спыненьні спальваньня вёсак і рэпрэсаваньня бязьвіннага насельніцтва;

2) стварэньні ўмоваў вяртаньня людзей зь лясоў дадому й рэальных гарантыяў, што да іх ня будуць ужытыя рэпрэсіі;

3) утварэньні супольнае нямецка-беларускае камісіі, задачаю якой была-б выпрацоўка рэкамэндацыяў у гэтай справе й кантроль за іх выкананьнем.

Паводле ўспамінаў Аўгена Калубовіча, былога сябра Камітэту даверу й удзельніка гэтае сэсіі, пратэст і прапановы Камітэту выклікалі абурэньне сярод удзельнікаў-немцаў. «За сталамі кіраўнікоў службы бясьпекі, а яшчэ больш афіцэраў войскаў СС, ахоўнае паліцыі й жандармэрыі, – пісаў А.Калубовіч, – узьняліся крыкі, шум і пратэсты абурэньня. Калі Аляксандар Русак (у канцы 1943 быў бурмістрам Баранавічаў і адначасна дырэктарам сярэдняе гандлёвае школы ў Баранавічах – Рэд.) скончыў свой даклад і перадаў генэральнаму камісару Кубэ дакладную запіску, выступіў генэрал Цэнэр, спрабуючы апраўдаць карныя акцыі супраць вёсак. Мы зьдзівіліся, калі Кубэ, насуперак генэралу Цэнэру, пачаў апраўдвацца перад Камітэтам даверу, даказваючы, што ён не нясе віны, за гэтыя расправы над насельніцтвам, што іх чыняць незалежныя ад яго органы, і што ён, як быццам, пра гэта накіраваў рапарт у Бэрлін. Нашыя апасеньні, што Камітэт даверу арыштуюць, ня спраўдзіліся. В.Іваноўскаму (адзін з пачынальнікаў беларускага руху XX ст.; прафэсар, зь лістапада 1941 – бурмістар Менску – Рэд.) не прыйшлося чытаць Дэкларацыю незалежнасьці, якая знаходзілася у нутранай кішэні яго пінжака (яна была спэцыяльна падрыхтаваная на выпадак арышту сяброў Камітэту – Ю. Т.). Але доўгі час не пакідала нас думка, што немць могуць яшчэ расправіцца з намі... Мы таксама не выключалі мажлівасьці, што органы СД і СС не даруюць і Кубэ».

Працяг будзе.

ФОТАХРОНІКА

Школьнікі.

Рэйкавая вайна.

Саюз Беларускай Моладзі.

Беларускія паліцыянты.

У партызанскім атрадзе.

У акупаваным Менску.

Фотаздымкі зь Дзяржаўнага архіву кінафотадакумэнтаў БССР.

КАНТАКТЫ

БЕЛАРУСЬ–НАРВЭГІЯ: НА ШЛЯХУ ДА ІНТЭГРАЦЫІ

Супрацоўніцтва паміж Беларусьсю й Нарвэгіяй пачалося ў мінулым годзе. Яго ініцыятарамі сталі прыватныя фірмы «Каргус», «Арнэвік», фірма па вырошчваньні саджанцаў на чале са сп.Крыстэнсэн, а таксама Дзяржэканомплян БССР.

Першым вынікам было стварэньне Беларускае вышэйшае народнае школы – міжнароднага экалягічнага й культурнага цэнтру. Гэткія школы існуюць у Нарвэгіі ўжо каля стагодзьдзя й даюць як агульную, так і спэцыяльную адукацыю. Першая была створаная дацкім сьвятаром сп.Грунтовічам. Што датычыцца Беларускае школы, дык яе слухачамі могуць стаць людзі любога ўзросту, дастаткова заплаціць за навучаньне 1.500 руб. (для студэнтаў зь іншых краінаў – 5.000 $).

16 ліпеня на прэс-канфэрэнцыі ў Менску рэктар Агдэрскае народнае школы Ян Огрман сказаў: «Важна тое, што ў Беларускай школе вучацца замежныя студэнты. Гэта сьведчыць пра ўключэньне Беларусі ў міжнародны працэс».

Плянуецца абмен дэлегацыямі, стварэньне прадстаўніцтваў у абодвух краінах і пераход ад кантактаў паміж асобнымі фірмамі да сувязяў паміж гарадамі й рэгіёнамі. Нарвэжскі бок абмяркоўвае пытаньне аб уступленьні ў Беларускі акцыянэрны банк. Найбольш іх цікавяць пэрспэктывы супрацоўніцтва ў перапрацоўцы гародніны й журавінаў. Ідзе праца над праектамі па пастаўцы ў Нарвэгію ружаў, бэзу й інш., абмену навуковай інфармацыяй і студэнтамі.

Любое супрацоўніцтва мае на ўвазе выгады. Для нарвэжцаў гэта – танная сыравіна й сьціплы партнэр. Беларусь-жа атрымоўвае шанец для разьвіцьця й умацаваньня свае эканомікі й асабліва садаводства.

Чаму менавіта наша Рэспубліка? «Мы выбралі Беларусь таму, што добра разумеем праблему Чарнобыля, – сказала сп. Пунтэрвольд. – Яна блізкая да Нарвэгіі, і мы-б не хацелі, каб вашая Рэспубліка засталася сам-насам у вырашэньні гэтае праблемы. Мы ўсе адказныя за нашую Зямлю».

Анастасія КАЗЛОВА.

ЗАВОДЫ Й ФАБРЫКІ

«ЧЫРВОНЫ БАРАЦЬБІТ» АДМАЎЛЯЕ ВЭТЭРАНАМ

Імкнучыся сьцішыць хвалю красавіцкіх страйкаў, адміністрацыя аршанскага заводу «Чырвоны барацьбіт» выканала эканамічныя патрабаваньні рабочых – аплата іхняе працы была павялічаная.

Але ўжо ў чэрвені гэтае рашэньне было скасаванае. У ведамасьці заробкаў ад 14.07.91. пазначана:

- С.Каваленка – 79 руб. 14 к.
- А.Казлоў – 79 руб. 16 к.
- М.Астапенка – 79 руб. 16 к.

Такія грошы атрымалі работнікі ліцейнага цэху, у якім большасьць работы – ручная. Менавіта цяжкае эканамічнае становішча рабочых стала прычынаю страйку, які адбыўся на заводзе ў пачатку ліпеня. Тады-ж быў створаны арганізацыйны камітэт па правядзеньні заводзкае прафсаюзнае канфэрэнцыі, якая адбылася 18 ліпеня.

На канфэрэнцыі былі прапанаваны два варыянты парадку дня – ад прафсаюзнага камітэту, які, дарэчы, узначальваў былы сакратар парткаму заводу, і ад аргкамітэту, створанага рабочымі. Большасьцю галасоў быў прыняты парадак дня, прапанаваны аргкамітэтам:

- –недавер прафкаму;
- –выбары старшыні прафкаму;
- –становішча на заводзе.

Да аргкамітэту зь пісьмовай заявай зьвярнуўся Савет вэтэранаў заводу, які ад імя 260 вэтэранаў прасіў даць ім дэлегацкія правы, бо яны ня маюць уласнае прафсаюзнае арганізацыі. У адказ было заяўлена, што вэтэраны цалкам кантралююцца адміністрацыяй. Пасьведчаньні дэлегатаў канфэрэнцыі, выдадзеныя вэтэранам, былі скасаваныя.

Быў абраны новы склад прафкаму «Чырвонага барацьбіта», які, на думку рабочых, здолее абараніць іхнія інтарэсы." Лідэр аршанскіх рабочых М.Разумаў прысутнічаў на канфэрэнцыі ў якасьці назіральніка.

(Паводле Ю.Копціка.)

СУАЙЧЫННІКІ

Мікола ДАВІДЗЮК: У татальнай безнадзейнасьці ёсьць надзея



Імя Міколы Давідзюка мала каму вядомае ў БССР. Значна лепш яго ведаюць у Швэйцарыі, Англіі, Францыі, дзе карціны Давідзюка прадстаўлялі польскае мастацтва, і, пэўна-ж, на ягонай радзіме – у Польшчы. 5 ліпеня сёлета ў Дзяржаўным мастацкім музэі БССР была адчыненая ягоная выстава – упершыню на Беларусі. Прапануем інтэрвію зь М.Давідзюком.

«Навіны»: Большасьць нашых чытачоў ведае пра Вас, як пра беларускага мастака з Лодзі, – і толькі. Ці не маглі-б Вы распавесьці пра сябе крыху больш падрабязна?

Мікола Давідзюк.: Я нарадзіўся й вырас у Польшчы, на Беласточчыне. Там я хадзіў у пачатковую школу, дзе ўсе прадметы за першае па чацьвертую клясу выкладаліся па-беларуску. Большасьць выхаваньня, якое я атрымаў, прыпала на гэтыя чатыры гады. Пазьней скончыў Гайнаўскі ліцэй – гэтак званы «беларускі», а на самой справе – польскі, бо адзінае беларускае што там было – мова, якая выкладалася як дадатковы прадмет. Тым, што зараз я мыслю й гавару па-беларуску, я абавязаны толькі сабе. Шмат хто з маіх сяброў, зь якімі я разам вучыўся, зусім не цікавіцца гэтым, так што заслуга школы досыць праблематычная. А ў справе адукацыі беларускае моладзі з часоў майго дзяцінства зьмянілася, на жаль, няшмат.

Потым паступіў у Вышэйшую мастацкую школу ў Лодзі. Цяпер працую ў гэтай школе выкладчыкам, стала жыву ў Лодзі.

«Навіны»: Вашае паходжаньне й Вашая творчасьць неяк зьвязаныя паміж сабою?

М.Д.: Натуральна. Існуе духоўнае жыцьцё, і ў час свайго дзяцінства я знаходзіўся пад яго ўплывам. Але выглядае гэта досыць складана. Я не магу выказваць ці падкрэсьліваць гэта, працягваючы нейкі мастацкі накірунак. Тым больш, што на Беласточчыне ніякіх асаблівых мастацкіх традыцыяў не было. Традыцыі – у фальклёры, у рэлігіі.

Менавіта іх уплыў сёньня адгукаецца ў маёй творчасьці, хаця, можа, і несьвядома. Хутчэй падсьвядома, бо я ніколі не імкнуўся безпасярэдна выказаць, падкрэсьліць у мастацтве сваю беларускасьць. Гэта быў-бы сьвядомы фальш. Калі падкрэсьліваць свае імкненьні – лёгка перайсьці да прапаганды, да нейкае газэтнасьці. Мастацтва – гэта таямніца, і галоўнае ў ім – не абвяшчаць свае ідэі, а захоўваць праўду.

«Навіны»: Вы абсалютны прыхільнік «чыстага мастацтва» або ўсё-ж прымаеце ўдзел у працы нейкіх грамадзкіх ці палітычных арганізацыяў?

М.Д.: Я стараюся на блытаць палітыку з мастацтвам – гэта небясьпечная справа, але як грамадзянін і як беларус не магу не цікавіцца тым, што адбываецца вакол мяне. Ад самага стварэньня Беларускага дэмакратычнага аб'яднаньня я сябра гэтае арганізацыі. Але-ж я жыву ў Лодзі – гэта даволі далёка ад Беласточчыны, на якой дзейнічае БДА. Таму я аказваю яму хутчэй маральную, часам – матэр'яльную падтрымку. Я ня дзеяч БДА, а зьвязаны зь ім хутчэй эмацыйна. Здольнасьць займацца палітыкаю – рэдкі дар, якім валодаюць далёка ня ўсе.

«Навіны»: Якія ўражаньні пакінуў у Вас побыт на Беларусі?

М.Д.: Я бачу, што тут адбываюцца вельмі важныя падзеі. Гэта нейкі пераломны момант. Тое, што дзеецца вакол, вельмі ўражвае мяне, вельмі хвалюе й адначасова мацуе духоўна. І, здаецца, у гэтай татальнай безнадзейнасьці ёсьць надзея. Яна падтрымлівае мяне.

Запісаў Ул.Панада,
фота аўтара.

ПАЛІТЫЧНАЯ СЬМЕРЦЬ ЯШЧЭ НЕ ПРЫЙШЛА

«Чуткі пра маю палітычную сьмерць трохі перабольшаныя,» – не бяз досьціпу заявіў 2-і сакратар ЦК КПБ А.Камай. Зьнікла яшчэ адна ілюзія памяркоўных дэпутатаў пра магчымасьць самаачышчэньня партыі. Пасьля публікацыі ў «Народнай газеце» артыкула «Адкуль валюта? Зь Менску» чакалася, што пленум ЦК КПБ пад націскам грамадзкае думкі пазбавіцца А.Камая. Аднак тых, хто смакаваў чуткі пра адпраўленьне другога сакратара ЦК паслом у адну з бананавых рэспублік, напаткае, паводле сьцьвярджэньня самога Аляксея Камая, расчараваньне.

«БАСОВІШЧА» – ФЭСТ МАЛАДОЕ БЕЛАРУСІ

Польшча (паводле М.Карневіча). *У Барыку, што пад Гарадком на Беласточчыне з 12 па 14 ліпеня адбыўся фэст музыкі маладое Беларусі «Басовішча». Гэта ўжо другі фэст, які ладзіць беларуская моладзь на Беласточчыне. Першы праводзіўся ў мінулым годзе. Сьвята, падобна, робіцца традыцыйным. Арганізатар «Басовішча» – Беларускае аб'яднаньне студэнтаў (БАС). У фэсьце ўзялі ўдзел вядомыя выканаўцы з Польшчы й Беларусі: Сяржук Сокалаў-Воюш, Лера Сом, Віктар Шалкевіч, гурты «Альбаросіка», «Мясцовы час», «Уліс», «Мроя» ды іншыя. Фэст спансэравалі польскі ўрад, згуртаваньне беларускае моладзі ў Амэрыцы, Беларускае грамадзка-культурнае таварыства ў Польшчы, а таксама некаторыя польскія фірмы.*

ЧАРТЭРНЫЯ РЭЙСЫ Ў НЯМЕЧЧЫНУ

15 ліпеня ў Менск прыбыў загадчык справаў Міністэрства па справах сям'і й аховы здароўя нямецкае зямлі Саксонія сп.Георг Шлехтэ. Мэта візіту – арганізацыя чартэрных авіярэйсаў для садзейнічаньня фонду «Дзецям Чарнобыля» па дастаўцы дзяцей з чарнобыльскіх раёнаў у Нямеччыну на адпачынак.

А «ПРАВІЦЬ» БУДЗЕМ МЫ

Нядаўная пастанова ЦК КПБ рэкамэндуе камуністам-дэпутатам выступіць з заканадаўчай ініцыятываю аб статусе «правячай партыі». І ўжо падрыхтаваны праект такога закону, які можа быць вынесены на бліжэйшай сэсіі беларускага парлямэнту. У сёньняшніх умовах, калі ў Вярхоўным Савеце БССР 80%, а ў мясцовых – 62% складаюць дэпутаты-камуністы, прыняцьце закону аб статусе «правячай партыі» да прыняцьця й увядзеньня новага Закону пра выбары – азначае аднаўленьне 6-га пункту Канстытуцыі. Бо зараз, калі кампартыя мае колькасную перавагу ў Саветах, менавіта яна будзе вызначаць колькасьць і намэнклятурны склад дзяржаўных пасадаў. Атрам пастановы трэба аддаць належнае: ва ўмовах, калі паўсюдна патрабуюць дэпартызацыі структураў, – гэта бліскучы тактычны крок.

КАНАДА НІЧЫМ НЯ ГОРШАЯ

100 дзяцей з забруджаных у выніку чарнобыльскай катастрофы раёнаў Беларусі павінны былі ў ліпені паехаць на адпачынак і аздараўленьне ў Югаславію. Але югаслаўскі камітэт «Дзеці Чарнобыля» з-за сутыкненьняў у Славеніі вымушаны быў ануляваць сваё запрашэньне. Як сказаў старшыня ўправы Беларускага дабрачыннага фонду «Дзецям Чарнобыля» Г.Грушавы, гэтая група дзяцей паедзе сёлета ўлетку, але ў Нямеччыну, Польшчу або Канаду.

ПАРТЫЙНЫЯ САНКЦЫЯНЭРЫ

На прэс-канфэрэнцыі 8 ліпеня ў Менску А.Малафееў, сказаў, што летась кампартыя не давала санкцыяў на правядзеньне пасяўных работаў на забруджаных тэрыторыях Беларусі. Але пры гэтым ён пацьвердзіў, што мела месца пасяджэньне супольнае камісіі бюро ЦК КПБ і Саўміна. Камісія пастанавіла праводзіць сяўбо на забруджанай тэрыторыі але толькі на фуражныя мэты. «Тое, што гэта цалкам бясьпечна, – заявіў А.Малафееў, – пацьвярджаецца досьведам гаспадарак Гомельскае й Магілёўскае вобласьцяў». Што-ж, досьвед Гомельскіх і Магілёўскіх гаспадарак шырока вядомы, – па выніках вымярэньня на радыёнукліды тамтэйшых мяса й малака.

ГЕРОЙ БЛЯКАДНЫХ ДЗЁН

Крымінальная справа, заведзеная на Міколу Разумава па факце блякаваньня ў красавіку гэтага году аршанскае чыгункі, перададзеная Вярхоўным судом БССР у магілёўскі абласны суд на дадатковае сьледзтва. М. Разумаў як адзін з сябровў Аб'яднанай дэмакратычнай партыі Беларусі выказаў жаданьне мець абарончцу ад свае партыі. Ім пагадзіўся быць сустаршыня АДПБ былы памочнік пракурора Бешанковіцкага раёну Віцебскае вобласьці Мікалай Турчаны. Пакуль-жа ад М.Разумава ўзялі падпіску пра нявыезд. Калі ўзгадаць, колькі апошнім часам рэспубліканскія ўлады ўзялі такіх падпісак, то складаецца ўражаньне, што гэта проста спосаб нэйтралізаваньня Закону аб эміграцыі.

У ДОБРЫ ЧАС!

2-і сакратар Гарадзенскага гаркаму КПСС-КПБ Уладзіслаў Гаўрыленка на Беластоцкім рынку прапаноўваў грамадзянам розныя тавары проста з багажніка аўтамабіля. Гарадзенская газэта «Пэрспэктыва» № 25 (31) дадала да гэтага факту наступны камэнтар: «Што-ж пачатак ёсьць, цяпер рынкавым адносінам у нашым горадзе быць. У добры час!»

Падборку падрыхтавалі Ул.Панада, А.Радкевіч, Р.Якаўлеўскі.

КРОНІКА

ПОШТА

Пашанцавала маці з сынам

М.Мянцюк, Л.Канатовіч, Н.Цынкевіч, дэпутат сельсакага савету й інш.:

«Мы жывем у вёсцы Канюшэўшчына Валожынскага раёну Менскае вобл. Мы, жыхары аднае з вуліцаў, на якой пражывае 18 сем'яў, зьвяртаемся менавіта да вас. Нашую вуліцу нават умоўна назваць вуліцаю нельга. Гэта доўгая яма, па якой можна праехаць ці праехаць толькі ў сьцюжу ці па вельмі сухім надвор'і. Увосень і ўвесну нават на трактары не заўсёды праедзеш. У той-жа час да дому, у якім жыве маці прэм'ера В.Кебіча, нядаўна паклалі асфальт.

Другая складанасьць – вада. Ісьці па яе даводзіцца далёка, і для старых гэта робіцца праблемаю. Да таго-ж, вада з бліжэйшае студні залівае гарод і дарогу».

Даведка. Вёска знаходзіцца на тэрыторыі з забруджанасьцю 5 Кю/км². Паводле вымярэньняў мясцовых жыхароў, зробленых пабытовым дазіметрам, вымяраньне складае ад 37 да 80 мкР/гадз.

Драўляныя дазіметры

Менская вобл., Вілейскі р-н., в.Даўгінава. Подпіс неразборлівы:

«Набыў я дазіметр, называецца «Сасна». І што-ж са зьдзіўленьнем выявіў: прыборам нельга вызначыць адпаведнасьць колькасьці радыянуклідаў у прадуктах норме. Безумоўна, спачатку трэба было даведацца пра гэтыя нормы. Дазіметар не разьлічаны на дакладнае вымярэньне такіх «малых» узроўняў. Ды й фон ён вымярае вельмі прыблізна. Да таго-ж апэрацыя гэтая даволі грувасткая: патрэбна найменш 5 вымярэньняў і вылічэньні. Узьнікае пытаньне: ці патрэбны ён зараз? Яшчэ некалькі гадоў таму, калі радыяцыя была большая, ён мог-бы быць карысны. А цяпер – навошта, ці можа чакаецца новы Чарнобыль?

Павелічэньне ракавых захворваньняў і генэтычных парушэньняў праяўляюцца ўжо цяпер, але гэта толькі пачатак. Вось толькі прадказаць павелічэньне гэтых хваробаў цяжка, паколькі ня ведаем дакладна, якую мы атрымалі (і яшчэ дадатковa атрымаем) дозу й ці даведаемся мы праўду аб гэтым у будучым.

А дазіметар, дарэчы, сапсаваўся, не прапрацаваўшы й некалькіх месяцаў. Выслаў-бы рамантаваць гэты выраб на завод, ды вось адна бяда – у пашпарце прыбора не пазначаныя каардынаты таго прадпрыемства».

У газэце «Чернобыль. Здоровье. Человек», падпісанай радаю заснавальнікаў, у свой час было паведамлена: «Гама-бэтарадыёмэтар «Сасна» створаны часовым творчым калектывам пад кіраўніцтвам член-карэспандэнта АН БССР У.Несьцярэнкі. Прыбор дазваляе вымяраць моц вонкавае экспазіцыйнае дозы гама-выпраменьваньня ад 0,01 да 10 мбэр/гадз., вызначаць забруджваньне бэта-радыёнуклідамі скуры, вопраткі, памяшканьняў, глебы. З дапамогаю радыёмэтра магчыма будзе спраўджаць і забруджанасьць прадуктаў харчаваньня. Радыёмэтар пайшоў у сэрыйную вытворчасць на барысаўскім ВА «Экран».

Няхепская рэклама. Значна прасцей весьці радыялягічны кантроль, прадаючы насельніцтву мала чаго вартыя прыборы, чым эвакуяваць людзей з забруджаных тэрыторыяў.

Вучымся па-беларуску?

Міхал Раецкі, Кенінгтон (Аўстралія):

«Ці маглі-б вы падаваць у газэце статыстыку зь беларускіх школаў, дзе выкладовай моваю ёсьць беларуская, і як пашыраюцца гэткія школы на Беларусі?»

З гэтым пытаньнем рэдакцыя зьвярнулася ў Міністэрства народнае адукацыі БССР, адкуль мы атрымалі наступны адказ: у БССР працуе 3.421 школа зь беларускай моваю навучаньня. Большасьць сярод гэтых школаў – сельскія (г.зн., пераважна пачатковыя ці няпоўныя, часта беларускія толькі фармальна). Беларускамоўныя клясы створаны ў 489 школах. Летась 79,2% школьнікаў у Рэспубліцы вучыліся ў расейскамоўных школах, 20,8% – у беларускамоўных. У гарадзе й на вёсцы гэтыя лічбы складалі адпаведна 98,3 і 1,7 ды 28 і 72 працэнты. У пэрспэктыве, сьцьвярджаецца ў Міністэрстве, колькасьць расейскамоўных школаў будзе скарачацца за кошт стварэньня школаў зьмешанага тыпу з выкладаньнем на абедзьвюх мовах. Летась у дваццаці менскіх школах былі набраныя беларускамоўныя першыя клясы. Сёлета мяркуецца стварыць паралельныя беларускамоўныя клясы яшчэ ў 20 школах гораду. Згодна з пастановаю гарадзкога выканаўчага камітэту Баранавічаў, паралельныя беларускія клясы набіраюцца ў 17 з 23 школаў гораду.

У Міністэрстве адукацыі лічаць, што праз 10 гадоў выкладаньне ва ўсіх гэтых школах будзе весьціся выключна на беларускай мове. Але трэба ўдакладніць, што рашэньне аб пераводзе школы на тую ці іншую мову выкладаньня прымае не Міністэрства, а мясцовыя ўлады.

Ад рэдакцыі дадамо, што мы не падзяляем аптымістычнасьці гэтых прагнозаў, бо ёсьць прыклады прафанацыі беларускамоўнае адукацыі, не хапае настаўнікаў, падручнікаў ды й проста добрае волі.

Апрацаваў Ул.Панада.

НЕЛЬГА ЗАБЫЦЬ

КУРАПАТЫ, ВЫСОКІ СТАН, ЦАГЕЛЬНЯ, ІГУМЕНСКІ ЛЕС...

26 чэрвеня споўнілася 50 год расстрэлу калёны палітвязьняў пад Ігуменам (Чэрвенем).



Пасьля налёту нямецкае авіяцыі на Менск у ноч 25 чэрвеня НКУС распачаў эвакуацыю на ўсход каля 5 тысячаў «ворагаў народу», сярод якіх былі беларусы, палякі, украінцы, габраі й група літоўцаў каля 90 чалавек. Паводле сьведчаньня аднаго зь іх – ацалелага палкоўніка Літоўскае арміі Ёзаса Тумаса, які пасьля савецкае акупацыі Літвы ў 1940 быў звольнены ў запас, а 1 траўня 1941 арыштаваны НКУС і нейкі час знаходзіўся ў менскай турме, – чэкісты распачалі зьнішчэньне вязьняў ужо на вуліцах Менску, прыстрэльваючы або дабіваючы прыкладамі зьнясіленых арыштантаў, сярод якіх былі цяжарныя жанчыны й старыя. Такім чынам па дарозе было забіта каля 700 чалавек.
26-га, калі калёну прыгналі ў Чэрвень, на турэмным двары быў праведзены падзел вязьняў на крымінальнікаў і палітычных; першых запісалі дабраахвотнікамі ў Чырвоную армію, з астатніх сфармавалі тры групы: адна зь іх была пакінутая ў двары турмы, дзе й дачакалася прыходу немцаў, дзьве другія ноччу пагналі па Бабруйскай дарозе. У групе, дзе знаходзіўся палкоўнік Ё.Тумас, паводле ягонага сьведчаньня, было каля 750 чалавек. Праз некалькі гадзін іх ня стала.

«Калі калёна адышла ад турмы каля аднаго кілямэтру, ззаду пачуліся першыя два стрэлы зь пісталета, потым яны паўтараліся кожную хвіліну, а можа, нават, і часьцей, – піша Ё.Тумас у выдадзеных на Захадзе ўспамінах. – нкусаўцы расстрэльвалі тых, хто ішоў ззаду. Спачатку я падлічваў гэтыя стрэлы, аднак пасьля 47-га перастаў, бо лічыць далей не было сэнсу».

Каля 12-е гадзіны ночы калёна была абстраляная невядомымі. Падчас узьнятае таямнічай стралянінаю неразьбярыхі некалькі дзесяткаў вязьняў кінуліся ў лес. Вартаўнікі распачалі стральбу па іх, аднак каля 10 чалавек здолелі выратавацца; як высьветлілася потым, сярод іх было некалькі літоўцаў. З размоваў канвойных стала зразумела, што ў часе стралянiны зьніклі камандзіры, і нейкі старшы сяржант спрабаваў узяць камандаваньне на сябе. Аднак праз колькі хвілінаў зьявіліся афіцэры НКУС, якія прапанавалі шарагоўцам вэрсію пра нямецкіх парашутыстаў, якія нібыта напалі на калёну «з мэтаю вызваліць гэтую сволач». «Пачуўшы ад камісара такую вэрсію ляснога нападу, мы з палкоўнікам Пятруйцісам зразумелі, што яго інсцэнавалі самі нкусаўцы, і ён быў патрэбны ім, каб апраўдаць задуманае масавае зьнішчэньне вязьняў,» – згадвае Ё.Тумас.

«Лежачы, я нецярпліва чакаў, калі вартавых перавядуць на левы бок дарогі. Хвіліны здаваліся доўгімі, як гадзіны.

Нарэшце вартавым загадалі перайсьці на левы бок. Пасьля каманды яны прайшлі па ляжачых на бальшаку людзях, быццам па мосьце, і пашыхталіся на другім баку... Ня памятаю, як пераскочыў праз ляжачага палкоўніка Пятруйціса й другога мужчыну, і ці страляў хто-небудзь, калі я бег. Гэты момант зусім сьцерся з памяці. Апомніўся я толькі тады, калі да лесу заставалася некалькі крокаў, але ў гэты час распачалася страшэнная стралянiна. Нкусаўцы расстрэльвалі вязьняў з аўтаматаў і кулямётаў... Праз некалькі хвілінаў з боку Чэрвеня пад'ехалі два аўтамабілі й спыніліся каля таго мейсца, дзе раней раіліся камандзіры й камісары... Раптам прагучала жахлівая каманда: праверыць, ці не засталося жывых!»

Сябра Ё.Тумаса палкоўнік Ёнас Пятруйціс таксама выйшаў жывы з гэтае бойні, успаміны пра якую ён выклаў у кнізе «Як яны нас расстралялі». Сьведкамі гэтае трагедыі былі К.Малевіч, В.Шмідаў, С.Ігнатковіч, Г.Тарасік.

Паводле рашэньня Чэрвеньскага райвыканкаму ў 1990 ва ўрочышчы Цагельня былі ўсталяваныя мэмарыяльныя знакі ў памяць ахвяраў рэпрэсіяў 1930–1940, у тым ліку й згаданых вышэй палітвязьняў.

Як высьветлілася ў апошні час, Цагельня й Высокі Бугор, што знаходзяцца ў ваколіцах Чэрвеня, былі мейсцам масавага зьнішчэньня «ворагаў народу», другімі Курапатамі.

У чэрвеньскай раённай газэце «Ўперад» жыхар Чэрвеня У.Дарагуж у артыкуле «Курапаты Чэрвеньшчыны» (№№ 71–73, 108, 110–112 за 1989) прыводзіць успаміны сьведкаў. М.Лучанок: «Тут расстраляна й шмат жыхароў Чэрвеня... Незадоўга да вайны на хлебапякарні лопнула электралямпачка, шкло трапіла ў ёмістасьць зь цестам. Сьпісаць столькі не было ніякае магчымасьці, вырашылі сабраць асколкі. Сабралі, але ня цалкам. Нехта знайшоў у буханцы кавалачак – і да пракурора. А на буханцы кляймо – нумар брыгады. Усю брыгаду, а тады адны мужчыны працавалі хлебапёкамі, арыштавалі. Пакуль ішло сьледзтва, пачалася вайна, і ўсіх кончылі на Цагельні».

Яшчэ адным мейсцам катаваньняў у Чэрвені апроч турмы была міліцыя, якая разьмяшчалася на пл. Свабоды. У 37-м адсюль, як і з турмы, вазілі на расстрэлы ў Высокі Бугор. Гэтае мейсца знаходзіцца ў 4-х км ад Чэрвеня па дарозе на Іванічы. У 1977 падчас будаўніцтва дарогі з Высокага Бугра бралі пясок проста з касьцямі. Потым на мейсцы брацкае магілы сталінскіх ахвяраў у Высокім Бугры зрабілі звалку, куды звозілі сьмецьце з усяго гораду. Пазьней звалка была зьліквідаваная, а мейсца зраўнянае бульдозэрамі.

У гэтых мейсцах скончылі свой жыцьцёвы шлях бацькі й дзяды многіх цяперашніх жыхароў Чэрвеня. Вось толькі некаторыя імёны: Андрэй Тарасік, Кірыла Блізьнюк, Вікенці Аляшкевіч, Вацлаў Ружо, Шпакоўскі, фэльчар Кудзін, загадчык жывёлагадоўчае базы Гардон, жыхар Менскае вуліцы Іпаліт Андрашын, старшыня райвыканкаму Дэйка й многія іншыя.

Вядомыя таксама й імёны некаторых катаў, гэта супрацоўнікі міліцыі Галімскі й Корзун зь вёскі Лучнае, якія пэрсанальна расстрэльвалі людзей, турэмны лекар Шураўка, які арганізоўваў катаваньні й дамагаўся праз іх падпісаньня пратаколаў; дарэчы, пасьля вайны ён практыкаваў у Чэрвені.

Іван Тамашэвіч, які да вайны працаваў у пажарна-вахтавай ахове завода «Белплодгароднiна» ў Загор'і, падзяліўся сваімі ўспамінамі з У.Дарагужам: «З 17 па 18 жніўня 1937 дзяжурыў мой таварыш Шпак. Як раз у гэтую ноч расстрэльвалі ў лесе – непадалёк, на другі бок дарогі. Праз некалькі дзён мы знайшлі там тры вялікія ямы, засыпаныя пяском і замаскаваныя яловымі лапкамі. А ў ноч з 4 на 5 сьнежня дзяжурыў я. Шэсьць аўтамашынаў прайшло на Высокі Стан (у 1960-м Высокі Стан быў перайменаваны ў Высокі Бугор – К.М.), а затым пачуліся стрэлы. Але-ж гэта ня ўсё. Аб'ездчык лясьніцтва (Чэрвеньскага – К.М.) Янка Пархімовіч расказваў, што назаўтра шэсьць машынаў людзей расстралялі на Магілёўцы – зьлева, перад паваротам на Рудню Астравітую».

Паводле ўспамінаў настаўніка А.Сямёнава, у даваенныя гады з турмы на расстрэл выводзілі таксама ў роў за гарадзкімі могілкамі. Гэта было вельмі зручна для чэкістаў, ад турмы да рову якія 200 мэтраў. Электрык У.Алімпіеў засьведчыў, што ў 1954, калі адсюль бралі пясок для падсыпкі дарогі, «адкрылася вельмі шмат шкілетаў. У час дажджу сюды сьцякалася вада, утвараючы возера, і чарапы ўсплывалі. А тады ў горадзе насупраць пажарнай быў прыёмны пункт другаснае сыравіны, дзе працаваў нарыхтоўшчык Ворачка. Пацаны здавалі яму чалавечыя косьці й атрымлівалі грошы на напой ці марозіва».

Пэнсіянэр Мікалай Бабіч згадвае, што ў чэрвені 1941 яны з бацькам «перад Цагельняю выйшлі да дарогі й вось тут убачылі расстраляных. Колькі іх было? Ну пэўна, больш сотні. Аж да самага павароту на Грабянец. Адзін быў у вайсковай форме». Гэтыя словы хутчэй за ўсё датычацца расстрэлу калёны палітвязьняў.

Жыхар Падлеснае вуліцы Іван Аляшкевіч запомніў наступнае: «Пахаваньне праводзілі мой бацька, другія людзі, я таксама ўдзельнічаў. Большасьць забітых ляжала перад Цагельняю зьлева ад дарогі, частка справа. Я заўважыў, што дзе-нідзе стаяў посуд зь ежаю й вадой. Відаць, міласэрныя чэрвеньцы дапамагалі, як маглі, сьмяротна параненым людзям. Але-ж было й некалькі разьдзетых трупаў. Пэўна, нехта пажывіўся. На жэрдках зьнесьлі астанкі ў нізіну й закапалі ў двух мейсцах. Праўда, і пазьней яшчэ знаходзілі ў аддаленьні напаўзгнілыя трупы».

Настаўніца Галіна Самсонава распавяла, што на тэрыторыі самой турмы таксама ёсьць шмат магілаў. Калі пасьля эвакуацыі турэмнае абслугі, яна разам з другімі жыхарамі горада зайшла ў турэмнае памяшканьне, дык убачыла там у вузкім калідоры своеасаблівы басэйн крыві.

Курапаты курапацкія... Курапаты чэрвеньскія... Колькі такіх брацкіх магілаў раскідана па беларускай зямлі. А колькі беларусаў было панішчана ў чужых землях і асабліва ў расейскай. Ці здолеем мы калі-небудзь назваць імёны ўсіх ахвяраў і пакараць усіх катаў, у тым ліку й таго стар'ёўшчыка, які ў Чэрвені мяняў падлеткам косьці забітых на пятакі ды грывенікі на марозіва, у тым ліку й таго, хто маладушна прасаваў сваім бульдозэрам прабітыя кулямі чарапы, у тым ліку й таго, хто, як ад назойлівае мухі, адмахваецца ад крывавае гісторыі бальшавізму? Ці можа яны будуць ізноў пакараныя бальшавікамі?

20 ліпеня па ініцыятыве «Мартыралёгу Беларусі» й Саюзу палітычных вязьняў Літвы ў Чэрвеньскім лесе, дзе падчас сталінскіх рэпрэсіяў былі зьнішчаныя людзі, быў устаноўлены сымбалічны крыж і скульптурная кампазіцыя ў памяць нявінных ахвяраў.

Падрыхтавала Каміла Малевіч.

(Паводле матар'ялаў, пададзеных Саюзам палітвязьняў Літвы, а таксама Чэрвеньскае раённае газэты «Ўперад»).

Рэдакцыя ўдзячаная сп. Маі Кляшторнай за пасрэдніцтва ў атрыманьні матар'ялаў.

УШАНАВАНЬНЕ

ІГУМЕНСКІЯ ЖАЛЬБІНЫ

Фота Уладзіміра Сапагова й Уладзіміра Кармілкіна.

ВЯРТАНЬНЕ

АХВЯРЫ ЛЕВАШОЎСКАЕ ПУСТКІ

Прапануем вашай увазе пачатак сьпісу беларусаў і ўраджэнцаў Беларусі, расстраляных у Ленінградзе й пахаваных у адным з магільнікаў НКУС–КДБ у пасёлку Левашова. Цяпер Левашоўская пустка стала вядомым мейсцам памяці савецкага дзяржаўнага тэрору. Усяго тут ляжыць каля 40 тыс. чалавек з 1937–54 гадоў. Неўзабаве ў Левашове у памяць пра нашых замардаваных землякоў будзе ўстаноўлены крыж ад Беларускага Грамадзка-Культурнага Таварыства. Сярод забітых – беларусы й палякі, габраі й расейцы. Шмат працаўнікоў чыгункі. Амаль 10-я частка левашоўскіх ахвяраў (сярод вядомых) – сьвятары розных канфэсіяў. Сьпіс падрыхтаваў сябра праўленьня БГКТ у Санкт-Пецярбургу Анатоль Разумаў.

Аксяновіч Іван Сымонавіч, нарадзіўся ў 1890 годзе на ст. Лепель Лепельскага р-ну, з 1925 па 1937 – сябра ВКП(б), расеец, брыгадзір 22-е дыстанцыі Кастрычніцкае чыгункі, пражываў на ст.Грузіна Кастрычніцкае чыгункі ў ведамасным доме. Вырок прыведзены ў выкананьне ў жніўні 1937.

Бабарыка Сяргей Георгіевіч, нарадзіўся ў 1901 годзе ў г. Капыль, беспартыйны, беларус, майстар арцелі «Мэбельшчык», пражываў у Ленінградзе. Вырок прыведзены ў выкананьне ў верасні 1937.

Банкоўскі Антон Ігнатавіч, нарадзіўся ў 1906 у в. Зайцава Асьвейскага р-ну Полацкай акругі, беспартыйны, паляк, хрыміроўшчык цэху №6 прамкамбінату Петрарайсавету, пражываў у Ленінградзе. Вырок прыведзены ў выкананьне ў кастрычніку 1937.

Бараноўскі Іван Станіслававіч, нарадзіўся ў 1882 у м. Сьвіслач Гарадзенскае губ., беспартыйны, беларус, пажарны работнік лягераў арт. акадэміі, пражываў у г. Лузе Ленінградзкае вобл. Вырок прыведзены ў выкананьне ў лістападзе 1937.

Белікаў Леанід Сяргеевіч, нарадзіўся ў 1910 у г. Лунінец, беспартыйны, расеец, намесьнік старшыні калгасу «Пулкава», пражываў па мейсцы працы. Вырок прыведзены ў выкананьне ў кастрычніку 1937.

Бельчанка Баніфацы Рыгоравіч, нарадзіўся ў 1895 у в. Асарэвічы Камарынскага р-ну Гомельскай вобл, сябра ВКП(б) з 1921, выключаны ў сувязі з арыштам, беларус, дырэктар 2-е Пскоўскае МТС, пражываў у Пскове. Вырок прыведзены ў выкананьне ў лістападзе 1937.

Бобрык Мікалай Савельевіч, нарадзіўся ў 1906 у в. Нябышана Бягомльскага р-ну, беспартыйны, беларус, вулканізатар заводу імя Молатава, пражываў у Ленінградзе. Вырок прыведзены ў выкананьне ў жніўні 1937.

Вайнштэйн Рыгор Ільіч, нарадзіўся ў 1907 у в. Мартынаўка Чэрвенскага р-ну, беспартыйны, студэнт Хіміка-тэхналягічнага інстытуту. Вырок прыведзены ў выкананьне ў жніўні 1937.

Вангесаў Мікалай Піліпавіч, нарадзіўся ў 1884 у м. Усьвяты Вяліжскага ўезду, беспартыйны, расеец, майстар падсобнага цэху паравознага дэпо ст. Ленінград-Пасажырскі-Маскоўскі. пражываў у Ленінградзе. Вырок прыведзены ў выкананьне ў жніўні 1937.

Волкаў Пятро Канстанцінавіч, нарадзіўся ў 1880 у в. Шаломава Мехаўскага р-ну, беспартыйны, расеец, малодшы кандуктар пасажырскіх цягнікоў Кіраўскае чыгункі, пражываў на ст. Пела ў пасёлку Атраднае. Вырок прыведзены ў выкананьне ў лістападзе 1937.

Вяржыцкі-Верасаў Іван Фядотавіч, нарадзіўся ў 1894 у Гародні, беспартыйны, расеец, загадчык пякарні №16 райтрансгандальхарчу-5 Кастрычніцкае чыгункі, пражываў у Ленінградзе. Вырок прыведзены ў выкананьне ў кастрычніку 1937.

Вярэйка Андрэй Адамавіч, нарадзіўся ў 1873 у в. Данейка Навагрудзкага ўезду, беспартыйны, беларус, бяз пэўнага занятку. Пражываў у г. Ладзейнае Поле. Вырок прыведзены ў выкананьне ў жніўні 1937.

Галубоўскі Васіль Іванавіч, нарадзіўся ў 1886 ў в. Закраснае Сіроцінскага р-ну, беспартыйны, расеец, праваднік 2-га машыннага аддзяленьня Кастрычніцкае чыгункі, пражываў у Слуцку Ленінградзкай вобл. Вырок прыведзены ў выкананьне ў жніўні 1937.

Гардзіенка Гарасім Мікалаевіч, нарадзіўся ў 1878 у в. Парэчча Лепельскага ўезду, беспартыйны, расеец, вартаўнік Ленаблхарчгандлю ў г. Сестрарэцку Ленінградзкай вобл, пражываў тамсама. Вырок прыведзены ў выкананьне ў кастрычніку 1937.

Гарэлік Ісак Рувімавіч, нарадзіўся ў 1909 у г. Жлобін, беспартыйны, габрай, тэхнік заводу імя Ягорава, пражываў у Ленінградзе. Вырок прыведзены ў выкананьне ў кастрычніку 1937.

Гелькаў Апанас Сымонавіч, нарадзіўся ў 1883 у в. Сідаровічы Быхаўскага ўезду, беспартыйны, расеец, дыякан Андрэеўскага сабору, пражываў у Ленінградзе. Вырок прыведзены ў выкананьне ў верасьні 1937.

Гершт Самуіл Львовіч, нарадзіўся ў 1887 у в. Шлятні Расонскага р-ну, беспартыйны, габрай, нарыхтоўчык Прыгараднага сельпа ў г. Лузе Ленінградзкай вобл., пражываў тамсама. Вырок прыведзены ў выкананьне ў лістападзе 1937.

Гіндзін Шэвель Шлёмавіч, нарадзіўся ў 1890 у Полацку, беспартыйны, габрай, сьлесар 12-га вагоннага ўчастку, пражываў у Ленінградзе. Вырок прыведзены ў выкананьне ў жніўні 1937.

Глушчанок Аляксандар Захаравіч, нарадзіўся ў 1894 у м. Вяржболава Сувальскае губ., беспартыйны, расеец, шавец майстэрні ЖАКТ № 12, пражываў у г. Лузе Ленінградзкай вобл. Вырок прыведзены ў выкананьне ў жніўні 1937.

Грайка Лука Іванавіч, нарадзіўся ў 1887 у в. Плюсканоўцы Гарадзенскага ўезду, беспартыйны, расеец, рэгент Андрэеўскага сабору, пражываў у Ленінградзе. Вырок прыведзены ў выкананьне ў верасьні 1937.

Грамовіч Канстанцін Мікалаевіч, нарадзіўся ў 1913 у в. Вішнеўка Самахвалавіцкага р-ну, беспартыйны, беларус, электраманцёр вагонарамонтнага пункту ст. Ладзейнае Поле, пражываў тамсама. Вырок прыведзены ў выкананьне ў кастрычніку 1937.

Грыбайла Іван Мікітавіч, нарадзіўся ў 1878 у в. Прыхабы Бялыніцкага р-ну, беспартыйны, расеец, цясьляр гаркамгасу, пражываў у Кіраўску. Вырок прыведзены ў выкананьне ў жніўні 1937.

Гусянкоў Еўдакім Іванавіч, нарадзіўся ў 1901 у в. Парвальле Віцебскае губ., сябра ВКП(б), расеец, турбіншчык заводу «Партызан», пражываў у г. Кінгісэп Ленінградзкае вобл. Вырок прыведзены ў выкананьне ў лістападзе 1937.

Данькоў Дзьмітры Іванавіч, нарадзіўся ў 1885 у м. Усьвяты, беспартыйны, расеец, сьлесар вагонарамонтнага заводу імя Кагановіча, пражываў у Ленінградзе. Вырок прыведзены ў выкананьне ў верасьні 1937.

Дзевятуха Васіль Максімавіч, нарадзіўся ў 1896 у в. Якубоўшчына Дзісенскага ўезду Віленскае губ., беспартыйны, беларус, загадчык крамы № 56 Мурмангандлю, пражываў у Мурманску. Вырок прыведзены ў выкананьне ў жніўні 1937.

Допкін Міхал Лазаравіч, нарадзіўся ў 1910 у Віцебску, беспартыйны, габрай, нарыхтоўшчык арцелі «Ўдарнік». Вырок прыведзены ў выкананьне ў кастрычніку 1937.

Жарнасек Карл Піліпавіч, нарадзіўся ў 1894 у в. Даўжаны Віленскае губ., беспартыйны, беларус, кіроўца 14-е дыстанцыі Кастрычніцкае чыгункі, пражываў на ст. Ганчына. Вырок прыведзены ў выкананьне ў кастрычніку 1937.

Замбржыцкі Фёдар Антонавіч, нарадзіўся ў 1913 у в. Зубарэвічы Глускага р-ну, беспартыйны, беларус, чырвонаармеец 101-га асобнага будаўнічага батальёну. Вырок прыведзены ў выкананьне ў лістападзе 1937.

Зейла Ігнацы Мартынавіч, нарадзіўся ў 1864 у в. Бушляры Дзьвінскага ўезду, беспартыйны, паляк, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Парыцы Красногвадзейскага р-ну Ленінградзкае вобласьці. Вырок прыведзены ў выкананьне ў жніўні 1937.

Зуеў Марк Цімафеевіч, нарадзіўся ў 1896 у в. Веручэньне Полацкага ўезду Віцебскае губ., расеец, да 1937 сябра ВКП(б), выключаны перад арыштам, каваль дэпо Фінляндзкае, пражываў у Ленінградзе. Вырок прыведзены ў выкананьне ў лістападзе 1937.

Іваноўскі Ўсевалад Леанідавіч, нарадзіўся ў г. Слонім Гарадзенскае губ., беспартыйны, расеец, бухгальтар Гаржылсаюзу, пражываў у г. Лузе Ленінградзкае вобл. Вырок прыведзены ў выкананьне ў жніўні 1937.

Кавалёў Іларыён Іпатавіч, нарадзіўся ў 1881 у в. Хатоўня Новабыхаўскага р-ну Магілёўскае вобл., беспартыйны, расеец, рабочы участка электрыфікацыі Кіраўскае чыгункі, пражываў на ст. Кола Кіраўскае чыгункі. Вырок прыведзены ў выкананьне ў лістападзе 1937.

Казлоўскі Сьцяпан Анупрыевіч, нарадзіўся ў 1907 у в. Уланаўшчына Радуньскае валасьці Віленскае губ., беспартыйны, паляк, калейны наглядчык Кастрычніцкае чыгункі, пражываў на ст. Папоўка. Вырок прыведзены ў выкананьне ў жніўні 1937.

Карабановіч Уладзіслаў Іванавіч, нарадзіўся ў 1862 у в. Буды Брадзецкай валасьці Менскае губ., паляк, беспартыйны, саматужнік, пражываў у в. Курыцына Пашскага р-ну Ленінградзкае вобл. Вырок прыведзены ў выкананьне ў лістападзе 1937.

Кучынскі Ігнацы Ігнатавіч, нарадзіўся ў в. Зарэчча Талачынскага р-ну, беспартыйны, расеец, студэнт ЛІФЛІ. Вырок прыведзены ў выкананьне ў жніўні 1937.

Водгукі просім накіроўваць на адрас: 191069, Ленинград (Санкт-Петербург), ул. Садовая,18. Государственная Публичная библиотека им. М.Е.Салтыкова-Щедрина. А.Разумову.

Навіны

Ліпень, 5'1991

Рэдактар Алесь Суша

Нумар падрыхтавалі: Алена Галаўчак, Павел Данейка, Юры Дракахруст, Лілія Карабко, Аляксандар Куцаў (камэрцыйны дырэктар), Аляксандар Лазоўскі, Ірына Лазоўская (нам. рэдактара), Уладзімір Панада, Юры Рагуля, Андрэй Рамашэўскі, Павел Тушынскі.

Заснавальнік Зянон Пазьняк. Ліцэнзія №67. Меркаваньне аўтараў публікаваных матар'ялаў не абавязкова супадае зь меркаваньнем рэдакцыі й кіраўніцтва БНФ. Рукапісы рэдакцыя не рэцэнзуе й не вяртае.

Адрас рэдакцыі: 220050, Менск, вул.К.Маркса, 25–79. Тэл. 27-06-04.

Типография. г. Орша, ул. Минская, 3. Сп. печати офсетный. Объем 2 п. л. Тираж 15 тыс. Зак. №3027